ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выдання XV
№ 82 (4334)
ПАНЯДЗЕЛАК, 11 красавіка 1933 г.
МЕНСК, Савецкая 63

Сёньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Выпруціць абязьлічку і безгаспадарчасьць у жывёлагадоўчых саўгасах.
Б. ПАПОУ — Чаму вучыць справа настаўніка Кармова (2-3 стар.).
Ільнаводчыя раёны — у тыле падрыхтоўкі да сяўбы (1 стар.).
Усебеларуская канфэрэнцыя па якасьці лёгкай прамысловасьці (1 ст.).
АГЛЯД ДРУКУ — Супроць недаацэнкі аднаасобнага сэктару (2 ст.).
Арганізуем грамадзкія агляды сацспаборніцтва (2 стар.).
ПАСТАНОВА НАРКАМЗЕМУ І ПРАУЛЕНЬНЯ КАЛГАСЦЭНТРУ БССР аб прымусовым ограмаджаньні жывёлы (3 стар.).
ПАРТБУДАЎНІЦТВА — Па-бальшавіцку змагацца за разьвіцьцё і арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне с.-г. арцелі — У часе пяцідзесьніка забясьпечыць рэалізацыю рацыянальнатэрскіх прапаноў (3 стар.).
Армейскі камсамол ідзе ў радох перадавых барацьбітоў ха аўладаньне ваеннай тэхнікай (4 стар.).
КІТАЙ — Імпэрыялісты прыступілі да падзелу Кітаю (4 стар.).
2 мільёны фінскіх марак на арганізацыю тэрарыстычных актаў у СССР (4 стар.).
Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі (4 стар.).

Выпруціць абязьлічку і безгаспадарчасьць у жывёлагадоўчых саўгасах

Жывёлагадоўчыя саўгасы павінны адыграць буйнейшую ролю ў вырашэньні жывёлагадоўчай праблемы. Сыстэма жывёлагадоўчых саўгасаў ужо стала буйным вытворцам мяса і малака.

БССР у вырабе мяса займае вытатнае месца. Пад кіраўніцтвам КП(б)Б, БССР зрабіла вялікі крок наперад у справе рэарганізацыі старых універсальных саўгасаў і арганізацыі сацыялістычных сьвінагадоўчых фабрык мяса. У вялікіх труднасьцях, у абстаноўцы жорсткай клясавай барацьбы, наперакор прароцтвам правых апартуністаў, закладзен моцны фундамант сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

У жывёлагадоўчых саўгасах БССР ужо скапцентравана стада ў 30 тыс. штук буйной рагатай жывёлы і 80 тыс. штук сьвіней.

Аднак, адзначаючы гэтыя дасягненьні, нельга прайсьці міма, нельга ня бачыць тых буйных недахопаў, якія яшчэ ёсьць у рабоце нашых жывёлагадоўчых саўгасаў. Праўда, стварэньне высока-таварных сацыялістычных мясных і малочных фабрык — справа новая, нялёгкая. Але было-б вялікім злачынствам перад партыяй і рабочай клясай звальваць усе недахопы ў рабоце жывёлагадоўчых саўгасаў на нязную справы.

Нашы дасягненьні ў справе будаўніцтва жывёлагадоўчых саўгасаў маглі быць значна большымі, роля саўгасаў у забесьпячэньні працоўных магла быць значна выпэйнай, калі-б работнікі жывёлагадоўчых саўгасаў поўнасьцю ўсьвядомілі тыя задачы, якія былі перад імі пастаўлены партыяй і ўрадам.

Брыгады ЦК і ЦКК УсеКП(б), якія абсьледавалі ў БССР 16 саўгасаў, маль ва ўсіх абсьледаваных гаспадарках выявілі адзін і той-жа малюнак: паўнейшая безгаспадарчасьць, непалажканасьць вытворчых працэсаў, дрэнны догляд жывёлы, разбазарваньне кармоў і надта высокі процант ушалку маладняка, з прычыны ігнараваньня элемэнтарных зоатэхнічных правіл.

Усё гэта зьяўляецца вынікам таго, што ў радзе саўгасаў яшчэ нагладзецца ўпартае супраціўленьне ўкараненьню ў саўгасную вытворчасьць шасьці гістарычных умоў тав. Сталіна. Аўладаньне тэхнікай для раду дырэктароў і партыйных арганізацый саўгасаў засталося толькі голым лёзунгам, не ператвораным у справу.

Толькі гэтым можна тлумачыць, што ячэйка, напрыклад, саўгасу «Бранчыцы» ні разу не абмяркоўвала пытаньняў захаваньня маладняка, арганізацыі працы, зьніжэньня сабекошту прадукцыі. Толькі ігнараваньнем дырэктыў партыі можна вытлумачыць тое, што ячэйкі і рабочкомы саўгасаў «Харомцы» і «Вясновка» ў канцы першага кварталу 1932 г. ня ведалі квартальнага заданьня па здачы таварнай прадукцыі, а на вачох дырэкцыі саўгасаў імя Сталіна і «Весьнёва» расьцягваліся і раскрадваліся тысячы пудоў кармоў. Толькі гэтым-жа можна вытлумачыць тое, што ў саўгасе «Насовічы» печы сьвінарнікаў былі ператвораны ў крематорыі, дзе спальваліся трупы дзесяткаў парасят з нотай утойваньня высокага процанту адыходу маладняка.

Толькі з прычыны безгаспадарчасьці, адсутнасьці ўсякага ўліку і кантролю 2.700 сьвіней былі разбазараны ў саміх саўгасах.

Сыстэма кіраўніцтва саўгасамі з боку трэсту была нездавальняючая, не адпавядала ўмовам новай абстаноўкі. У БССР пры арганізацыі была праўдзена гігантаманія, якая шкодна адбілася на саўгасным вытворчасьці.

У радзе саўгасаў мы яшчэ зараз маем ад 3 да 7 вытворчых вучасткаў, якія знаходзяцца на вялікай адлегласьці адзін ад другога. Ясна, што ў такіх саўгасах дырэктар зьяўляецца не арганізатарам вытворчасьці, а толькі наезджым інспэктарам.

Інструкцыя Сьвінаводаб'яднаньня БССР аб арганізацыі вытворчасьці на аснове цэхавай спэцыялізацыі прыняла да таго, што за сьвінарамі замацоўваліся ня сьвіньні, а варштаты. Да апаросу матка знаходзілася на адным вучастку, у часе апаросу яна пераводзілася на іншы вучастак, пасьля апаросу — у трэці. Таксама і маладняк — да пэўнага ўзросту ён знаходзіцца на адным вучастку, потым пераводзіцца на другі і трэці. Гэтым фактычна была дазволяравана абязьлічка, якая ў сьвінагадоўлі страшней чумы.

Пастанова СНК СССР, ЦК УсеКП(б) і Наркамзему СССР аб рабоце жывёлагадоўчых саўгасаў выкрыла ўсе гэтыя недахопы і выявачыла рад буйнейшых мерапрыемстваў для кароннага паляпшэньня работы жывёлагадоўчых саўгасаў і далейшага іх разьвіцця.

Усю ўвагу партыя і ўрад сканцэнтроўваюць на задачах далейшага разгорнваньня стада за кошт захаваньня і галаваньня ўласнага прыплоду саўгасаў.

У БССР ужо прыступілі да рэарганізацыі жывёлагадоўчых саўгасаў на аснове прынцыпаў, указаных у пастанове ЦК УсеКП(б), СНК і НКЗ СССР. Замест цяперашняга трэсту Сьвінавод у БССР стварацца тры паасобныя сьвінагадоўчыя трэсты — у Менску, Магілеве і Воршы. Ужо распрацаваны і мерапрыемствы па разбуйненьні самі́х саўгасаў. Замест існуючых 85 сьвінагадоўчых саўгасаў арганізуецца 129. У першую чаргу новыя саўгасы стварацца ў найбольш далёкіх вытворчых вучастках. Кожны саўгасны вучастак, які можа забясьпечыць сабе ўласную кармовую базу, ператвараецца ў самастойны саўгас з павялічэньнем колькасьці сьвінаматак да 400.

Асноўным вытворчым вучасткам у саўгасе становіцца фэрма з закончаным абаротам стада, г. зн. з пастаянай колькасьцю матак, поўнай праграмай галаваньня стада, адкорму і здачы таварнай прадукцыі. У БССР пакуль ужо вызначана арганізаваньня 349 такіх фэрм, прычым у кожнай фэрме будзе ня больш 105 сьвінаматак з пастаянным абслугоўваючым персаналам.

Адлак, рэарганізацыя жывёлагадоўчых гаспадарак не павінна падымацца пасляжэнчай мітусьнёй, а ў першую чаргу павінна быць накіравана на поўнае выкананьне плянаў па здачы таварнай прадукцыі і адпаўленьне стада.

Работнікі жывёлагадоўчых саўгасаў павінны цьвёрда памятаць, што без выкананьня 6 умоў тав. Сталіна нельга дабіцца ніякага паляпшэньня ў арганізацыі саўгаснай вытворчасьці. У аснову ўсёй работы трэба пакласьці барацьбу за выкананьне якасных паказальнікаў, за адпаўленьне стада і поўнае захаваньне ўласнага прыплоду. Гэта задача ня можа быць выканана без аўладаньня тэхнікай. Уся армія рабочых і спэцыялістаў жывёлагадоўчых саўгасаў павінна павярнуцца тварам да зоатэхнікі.

Пастанову партыі і ўраду аб рабоце жывёлагадоўчых саўгасаў неабходна зараз-жа шырока папулярызаваць сярод усёй масы рабочых саўгасаў. У адказ на гэту пастанову рабочыя калектывы саўгасаў павінны ўдесяцярыць тэмпы падрыхтоўкі да сяўбы.

Трэцяя бальшавіцкая вясна павінна быць цалкам скарыстана на стварэньне ўласнай кармовай базы ў кожным саўгасе. Гэта можа быць дасягнута толькі пры правільнай расстаноўцы рабочай і цягавай сілы, пры правядзеньні раньняй сяўбы, максымальным скарыстаньні мясцовых угноеньняў, пры сапраўднай барацьбе за ўзьвяцьце ўраджайнасьці сацыялістычных палёў, пры ўмове бязьлітаснай барацьбы партыйнай і правымі, «левымі» апартуністамі і прыміренцамі.

Новыя дасягненьні савецкай тэхнікі

Дырыжабль „УК-1" паказаў надзвычай добрыя лётныя якасьці

Начальнік дырыжаблябудаўніцтва — Пурмоль, начальнік зборачных работ і намесьнік начальніка дырыжаблябудаўніцтва — Фланзэрман, памочнік па палітчастцы зборачных работ — Бэнфэльд — рапартуюць ЦК УсеКП(б)—тав. Сталіну, саўнаркому — тав. Молатаву, Галоўнаму Кіраўніцтву грамадзянскага паветранага флёту—тав. Гольцману, ЦК Асоавіяхіму—тав. Зійдэману аб тым, што «9 красавіка ў 8 гадзін 05 мінут быў вы пушчан у першы выпрабавальны палёт дырыжабль «УК-1» пад камандай камандзіра Ніжэўскага, першага памочніка Валконскага, другога памочніка Панькова, карабельнага інжынэра Гараканідзэ, старшага борт-мэханіка Кузьміна і борт-мэханіка Абадзінскага. Карабель знаходзіўся ў палёце 34 мінуты і паказаў надзвычай добрыя лётныя якасьці.

Карабель пабудован цалкам з савецкіх матар'ялаў работнікамі дырыжаблябуду пры ўдзеле работнікаў заводу «Каўчук» і Цагі ня канструкцыі і выкананьні ня ўступае перадавым заграничным машынам данага тыпу.

Прыступаючы з 10 красавіка да зборкі наступнага карабля «УК-2», рабочы і тэхнічны склад зборачных работ запэўняе партыю і ўрад, што мабілізуе ўсе свае сілы і энэргію для выпуску ў намечаны тэрмін і наступных паветраных караблёў.

Савецкія дэкартыкатары пры выпрабаваньні далі бліскучыя рэзультаты

ЛЕНІНГРАД, 9. Скончыліся выпрабаваньні першых савецкіх дэкартыкатараў. Выпрабаваньні далі бліскучыя рэзультаты. З двох дэкартыкатараў Дзепкасельскай станцыі і тэкстыльнага інстытуту (нітка 2), якія выпрабоўваліся, лепшым аказаўся дэкартыкатар нітка 2.

Дэкартыкатар пераапрацоўвае ільнасалому без падсушкі. Для апрацоўкі адной тоны ільнасаломы саматужным спосабам патрабуецца 37 чалавекадзён, на ільназаводах—10,4 чалавекадні, а на апрацоўку дэкартыкатарам патрабуецца толькі 9 чалавекадзён. Саматужным спосабам на працягу рабочага дня выробляецца 180 кгр. валакна. Заводзкія машыны даюць 200 кгр. Дэкартыкатар выпускае 300 кгр. лубу.

Рэзультаты прадзіва паказалі, што якасьць прадукцыі з лубу на 30 проц. вышэйшая, чым з лепшага ільназалакна.

9-ты дзень масавай генэральнай праверкі падрыхтаванасьці да сяўбы

Ільнаводчыя раёны—у тыле падрыхтоўкі

Неадкладна скончыць мабілізацыю насеньня тэхкультур.—Жорстка біць за ігнараваньне падрыхтоўкі аднаасобнікаў да сяўбы

Тэлеграма сакратара ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіча

Усім РК КП(б)Б і рэдактарам раённых газэт

Надаем выключна важнае палітычнае значэньне скліканым куставым міжраённым нарадам рэдактароў пасьцённых газэт. На райком партыі і рэдактара газэты ўскладаем адказнасьць за падрыхтоўку і выклік дэлегатаў.

Сакратар ЦК КП(б)Б
ШАРАНГОВІЧ.

Калгасы Любаньшчыны вышлі ў поле

ЛЮБАНЬ. (Па тэлеграфу). Рад калгасаў пачаў палявыя работы. Калгас «Іскра» 9 красавіка засеяў 5 гэкт. яравога жыта.

РАЙКАЛГАССАЮЗ.

320.000 га ільну і 50.000 га канапель —ня менш!

Перад БССР у бягучую пасеўную кампанію стаіць адказная задача—пашырыць пасеўную плошчу пад ільном да 320 тыс. га (супроць 240 тыс. га леташніх) і канопляміда 50 тыс. га (супроць 40 тыс. га ў 1931 г.).

Сучаснае становішча падрыхтоўкі да сяўбы тэхнічных культур у радзе раёнаў не забясьпечвае пасьпяховага выкананьня гэтага заданьня партыі і ўраду. Аб гэтым сьведчаць у першую чаргу недапушчальна нізкія тэмпы ссыпкі насеньня тэхкультур.

Ня гледзячы на тое, што БССР ужо шчыльна падышла да пачатку палявых работ, першая пяцідзеўка красавіка не дала літаральна ніякага зруху ў мабілізацыі насеньня ільну і канапель. Плян ссыпкі тэхкультур выкананы па рэспубліцы на 49,1 проц. су проць 73,2 проц. у сярэднім па ўсіх культурах і 76,9 проц. па збожжавых.

У глыбокім тыле цягнецца група раёнаў ільнаводных раёнаў (21 раён). Гэта група выканала ўсяго толькі 42,2 проц. пляну мабілізацыі ільнасемя, у той час, як збожжавых сабрала 74,6 проц. Страхавых фондаў тэхкультур ільнаводчымі раёнамі сабрана толькі 19,3 проц.

Наступным вельмі сур'ёзным недахопам зьяўляецца злачыннае ігнараваньне ў радзе раёнаў падрыхтоўкі аднаасобнага сэктару да сяўбы, апартуністычная недаацэнка яго ролі. Між тым, па БССР налічваецца 49,8 проц. яшчэ некалектывізаваных бядняцка-сераднцкіх гаспадарак, а па выдучых ільнаводчых раёнах — 43,2 проц. Аднак, сапраўды рашучых мер да забесьпячэньня выкананьня аднаасобнікамі пляну сяўбы яшчэ ў радзе месц ня ўжыта. Ссыпка страхавых фондаў ільнасемя па індывідуальным сэктары складае мізэрны процант. Давядзеньне пасеўных плянаў у парадку самаабавязацельстваў далёка няўсюды праведзена. Характэрным прыкладам служыць Жарскі сельсавет, Вушацкага ільнаводчага раёну, дзе аднасобнікі павінны засеяць амаль палову яравога кліну—841 га. Сельсавет нічога не зрабіў, каб забясьпечыць засеў аднаасобнікамі гэтай плошчы і ў першую чаргу ільном. Пасеўны плян даведзен толькі да 6 насельніч з 16, і гэтым пытаньне было вычарпана. У гэтым-жа сельсавеце праўленьні паасобных калгасаў скарацілі плян сяўбы ільну на 40-50 проц. Апартуністычнае кіраўніцтва ячэйкі і сельсавету не рэагуе на такія агідпасьці, не арганізуе рашучага адпору кулацкім вылазкам.

Аналёгічныя факты маюць месца ў Горацкім і Шклоўскім ільнаводных раёнах.

Непадрыхтаванасьць да сяўбы тэхнічных культур у некаторых раёнах зьяўляецца вынікам палітычнай недаацэнкі арганізацыямі гэтых раёнаў дырэктыў партыі аб фарсаваным разьвіцьці сацыялістычнага ільнаводзтва і вызначаных у гэтым напрамку мерапрыемстваў. І сапраўды, у адстаючых раёнах асабліва рэзка выпукляецца слабая работа па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, недапушчальна вялы тэмп арганізацыі вытворчых брыгад і грубыя памылкі ў ажыцьцяўленьні гэтага мерапрыемства. Тут да гэтага часу не разгорнута калгасная ўзаемадапамога і рэалізацыя насеннай пазыкі. Тут ігнаруецца аднаасобнік, а кіраўніцтва падрыхтоўкай да сяўбы носіць агульны, абстрактны характар.

Аб тым, якіх вялікіх посьпехаў можна дасягнуць пры правільным ажыцьцяўленьні партыйных дырэктыў, гаворыць вопыт многіх перадавых сельсаветаў і калгасаў, у прыватнасьці, КАЛЫШАНСКАГА сельсавету, Лёзьнянскага ільнаводчага раёну. Дзякуючы выразнаму, канкрэтнаму і сапраўды апэрацыйнаму кіраўніцтву парт'ячэйкі і сельсавету, дзякуючы разгорнутай масавай рабоце, гэты сельсавет у асноўным падрыхтаваны да сяўбы. Калгасы амаль поўнасьцю ссыпалі насеньне і адсартавалі яго. Машыны і інвэнтар адрамантаваны. Хаваньне насеньня арганізавана правільна. Вылучаны людзі, якія адказваюць за цэласьць фондаў. Конь знаходзіцца ў сярэднім целе. Гной па большасьці калгасаў вывезен у поле. Фуражныя фонды забраніяваны. Арганізацыя вытворчых брыгад заканчваецца. Аднаасобны сэктар ужо гатоў выйсьці ў поле і падрыхтаваны на ўсіх лініях. Гэта — вынік правільнай арганізацыйна-масавай работы, якая была разгорнута ячэйкай і сельсаветам сярод аднаасобнікаў, вынік мабілізацыі іх на барацьбу з кулаком.

БССР павінна даць звыш 320 тыс. га ільну і 50 тыс. га канапель! Выкананьне гэтай адказнай задачы вырашае фарсаваны тэмп скапчэньня падрыхтоўкі да сяўбы, як па калгасным, так і аднаасобным сэктары.

Плян пасеву ільну скарочан

ГОРКІ. У Астапаўскім сельсавеце 7 калгасаў. МТС дрэнна кіруе іх падрыхтоўкай да сяўбы. Даволі прывесьці такі факт, што насенныя фонды ільну па гэтых калгасах ссыпаны толькі на 46 проц.

У калгасе «Камунар» плян пасеву ільну скарочан на 45 гэкт.

Вытворча - фінансавыя пляны ня складзены.

Як МТС, так і сельсавет не рэагуюць на прыведзеныя факты, абмяжоўваючыся абяцаньнямі, што «ўсё бу дзе зроблена». Між тым вытворчыя брыгады ў калгасах усё яшчэ не арганізаваны. Вывазка гною ня скончана. Мінэральныя ўгнаеньні не завезены ні ў адзін калгас. Рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтару і збруі ня скончаны, а рамонт калёс зусім не распачаты.

Не пакончана з безгаспадарчасьцю і наплявацельскімі адносінамі да сельска-гаспадарчага інвэнтару і машын. У калгасе «Ленінскі шлях» трактарыст Матрошанка яшчэ ўвосень кінуў на полі ільнацерабілку, якая і зараз знаходзіцца там. Агранам Гарбачоў аб гэтым ведаў, але мер ня прыняў.

Сельсавет павінен па-баявому разгарнуць масавую самаправерку гатоўнасьці да сяўбы, каб ліквідаваць свае ганебнае адставаньне. Апартуністычнай стаўцы на саманёк паасобных работнікаў МТС і сельсаветаў трэба пакласьці канец.

Якубёнак Я.

Шклоўшчына недапушчальна адстае

ШКЛОЎ. (Наш кар.). Ссыпка насенных і страхавых фондаў тэхнічных культур па Шклоўскім раёне праходзіць жаруднымі тэмпамі. У той час, як плян засыпкі насенных фондаў па збожжавых культурах выкананы на 95 проц., па тэхнічных—усяго на 57,4 проц. Страхавых фондаў збожжавых ссыпана 47,1 проц., тэхнічных-жа—толькі 27,2 проц.

Апошнія 10 дзён не далі амаль ніякага аруку ў ссыпцы насеньня. Райсэкчастка, райкалгассаюз і МТС нават ня маюць дакладных вестак. Прыведзеныя лічбы не забяспечваюць сапраўднага становішча. Райсэкчастка на працягу ўсяго часу падрыхтоўкі да сяўбы ня склала ні адной зводкі ў раённае сельсаветаў, тлумачачы тым, што яны не даюць вестак. Але рашучых мер да такіх сельсаветаў ня прынята.

Складаньне вытворча-фінансавых плянаў закончана толькі ў 138 калгасах (усіх калгасаў у раёне 208). Вытворчыя брыгады арганізаваны толькі ў 117 калгасах.

Раённыя зямельныя арганізацыі яшчэ не ўзяліся за баявое ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4 лютага.

Пры складаньні вытворча-фінансавых плянаў і арганізацыі вытворчых брыгад мае месца рад грубейшых памылак. Пляны складаюцца габінэтна, без удзелу шырокіх мас калгаснікаў. За арганізаваныя брыгадамі не замацаваны самельныя вучасткі і інвэнтар.

Бюро РК КП(б)Б рашуча паставіла пытаньне перад фракцыяй райкалгассаюзу, райвыканкому, МТС і перад кожнай партыйнай ячэйкай аб неабходнасьці забясьпечыць у дакладны тэрмін выкананьне плянаў ссыпкі насенных і страхавых фондаў як у калгасах, так і ў аднаасобным сэктары.

Генэральная праверка павінна быць скарыстана для ліквідацыі недахопаў на ўсіх вучастках падрыхтоўкі да вясны.

Ян. Новікаў.

Калышанскі сельсавет у радох перадавікоў

ЛЁЗНА. (Наш кар.). Калышанскі сельсавет калектывізаваны на 80 проц. За ўдарнае праведзеньне другой бальшавіцкай сяўбы сельсавет атрымаў пераходны чырвоны сьцяг імя РК КП(б)Б і РВК. Ён ня раз прэміяваны за пасьляховае выкананьне раду палітычна-гаспадарчых кампаній.

Зараз Калышанскі сельсавет з посьпехам змагаецца за ўтрыманьне чырвонага сьцягу, за ўзорнае праведзеньне, пад кіраўніцтвам парт,-ячэйкі і сельсавету трэцяй бальшавіцкай вясны. Аб гэтым ярка гавораць факты.

Да сучаснага моманту ўвесь інвэнтар калгасамі адрамантаваны. Насенныя фонды ў большасьці калгасаў ссыпаны і адсартаваны. Па сельсавеце-ж у цэлым малюнак такі: насеньня збожжавых сабрана 111 проц. пляну, бульбы—87 проц. і выдучых культур—ільну і канапель—80 проц. (па раёне наогул ссыпана 57 проц.). У той час як агульна-раённае выкананьне заданьня па канопляным складае 42.2 проц., у Калышанскім сельсавеце яно даходзіць да 77.4 проц. Страхавыя фонды складзены па тэхнічных культурах—па 200 проц.. па збожжавых—на 132 проц.

Недахват насеньня ў некаторых калгасах пакрываецца шляхам разгорнваньня міжкалгаснай узаемадапамогі і мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў (рэалізацыя насеннай пазыкі).

Першыя дні генэральнай праверкі, якая правядзецца ў сельсавеце, паказалі, што калгасы «Авангард». «Энергія». «Прафінтэрн», «Пяцігодка». «Трэці рашаючы» і «Заветы Ільліча» поўнасьцю гатовы да выхаду ў поле. Генэральная праверка ўзьняла актыўнасьць калгаснікаў і паддагнула тыя калгасы, якія адсталі ад перадавікоў.

Вялікая ўвага аддана арганізацыі поўнага захаваньня да сяўбы сабранага насеньня. Паказальнай у гэтых адносінах зьяўляецца пастаноўка справы ў калгасе «Пяцігодка», дзе існуе строгі ўлік і кантроль. У сьвіране, дзе хаваецца насеньне, над кожным засекам прыбіта дошчачка з надпісам: якая культура, колькі яе і хто адказвае за хаваньне насеньня. Наколькі беражліва падыходзяць калгаснікі да захаваньня насеньня, сьведчыць такі, на першы погляд здавалася-б, дробны факт. Каб уніканць зьнішчэньня канапель пацукамі, гэтае насеньне ссыпана ў мяшок і падвешана на вяроўцы да столі так, што пацукі дабрацца да мяшка ня могуць.

Калгасы Калышанскага сельсавету паставілі перад сабой задачу: дабіцца салета ўзьняцьця ўраджайнасьці ільну да 3.5 цнт. чыстага валакна з гэктара. Яны энэргічнам загаюцца за выкананьне гэтай задачы. Як ужо заўважвалася, усё насеньне адсартавана. Гной па большасьці калгасаў вывезен на поле. Значная колькасьць попелу ўжо сабрана. Збор ідзе далей. Вялікім фактарам зьяўляецца таксама выкананьне летась 90 проц. пляну зяблёва. Каб правесьці раньнюю сяўбу (важнейшая ўмова ўзьняцьця ўраджайнасьці) вялікая ўвага аддана падрыхтоўцы каня. Праверка паказала, што кані ў калгасах Калышанскага сельсавету знаходзяцца ў сярэднім целе, а ў асобных калгасах яны добра ўпітаны. Абязьлічка каня канчаткова ліквідуецца. Фуражныя бранія-ваньня фонды сена, канопляны і аўса складзены ва ўсіх калгасах, за выключэньнем арцелі «Прафінтэрн». У ліквідацыі гэтага недахопу арцелі дапамагаюць астатнія калгасы.

Зараз парт'ячэйка і сельсавет пры дапамозе калгаснага актыву заканчваюць работу па арганізацыі вытворчых брыгад у калгасах.

Немалая ўвага парт'ячэйкай і сельсаветам аддаецца аднаасобнаму сэктару, які складае 20 проц. гаспадарак. Работа па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў вядзецца так, каб наблізіць да апошніх беднякоў і серадняко́ў—аднаасобнікаў. Праводзяцца сумесныя сходы калгаснікаў і аднаасобнікаў, на якіх заслухоўваюцца справаздачы праўленьняў калгасаў. Беднякі і сераднякі—аднаасобнікі дапамагаюць калгаснаму будаўніцтву.

У вышку разгорнутай масавай работы аднаасобны сэктар таксама ўжо падрыхтаваны да сяўбы. Інвэнтар адрамантаваны. Страхавыя фонды ссыпаны на 100 проц.

На аснове арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня існуючых калгасаў парт'ячэйка і сельсавет вядуць зараз палітычна-масавую работу па ўцягненьні ў калгасы астатніх бядняцка-сераднцкіх гаспадарак.

Атрыманыя посьпехі абумоўліваюцца правільным кіраўніцтвам парт'ячэйкі і сельсавету, разгорнутай імі арганізацыйна-масавай работай. У сваёй рабоце ячэйка і сельсавет апіраліся на калгасны актыў.

Вялікую ролю адыграла сапраўды сыстэматычнае канкрэтнае кіраўніцтва. Сельсавет кіруе не «наскул», а ўваходзіць ва ўсе дробязі калгаснага жыцьця, заўсёды ведае, што робіцца ў кожным сельсавеце, вёсцы. Гэта дае магчымасьць своячасова рэагаваць на тыя ці іншыя непарматнасьці і памылкі.

Калышанскі сельсавет завяршае падрыхтоўку да сяўбы. Калгасы і аднаасобнікі—беднякі і сераднякі праяўляюць зараз сваю баявую гатоўнасьць. Неадкладная задача партыйнай ячэйкі—правільна расставіць свае сілы па брыгадах, забясьпечыць свой уплыў і арганізуючую ролю ў кожнай калгаснай брыгадзе і групе.

Па Калышанскім сельсавеце павінны раўняцца адстаючыя сельсаветы, калгасы і вёскі Лёзьнянчыны.

А. Мінуцкі.

Усебеларуская канфэрэнцыя па якасьці лёгкай прамысловасьці

У БАЛЬШАВІЦКАЕ НАСТУПЛЕНЬНЕ НА БРАК!

Адкрыцьцё канфэрэнцыі

9-га красавіка ў памяшканьні Белдзяржтэатру адкрылася ўсебеларуская канфэрэнцыя ўдарнікаў якасьці прадукцыі лёгкай прамысловасьці. Канфэрэнцыю адкрыў адказны сакратар ЦСПСБ тав. Кавалёў. У прэзыдыум канфэрэнцыі выбрана 25 чал.: сакратар ЦК КП(б)Б тав. Жаброўскі, старшыня ЦКК КП(б)Б тав. Калнін, старшыня ЦСПСБ тав. Рыжоў, Паркацяжпрому тав. Грысевіч, рэдактар газэты «Снабжение, кооперация и торговля» тав. Нодэль, прадстаўнікі цэнтральных камітэтаў саюзу гарбароў, швэйнікаў, каапэрацыі і гандлю і інш.

У ганаровы прэзыдыум канфэрэнцыі выбрана палітбюро ЦК УсеКП(б), бюро ЦК КП(б)Б, прэзыдыум УсеЦСПС, сакратар ЦК УсеКП(б) тав. Постышаў, камандуючы Далёка-Усходняй арміяй тав. Блюхэр, Нач. ПУР'у тав. Гамарнік, сакратары ЦК—германскай кампартыі тав. Тэльман, кампартыі Польшчы тав. Ленскі.

На канфэрэнцыю прыбыла 75 дэлегатаў швэйных і абутковых фабрык БССР і каапэрацыйных арганізацый.

З 9 швэйных фабрык БССР мандаты атрымалі 5 прадпрыемстваў: «Кастрычнік», імя Валадарскага, «Камінтэрн», «Прафінтэрн», імя Крупскай. Пазбаўлены права ўдзелу на канфэрэнцыі з рашаючым голасам: швэйная фабрыка імя Дзяржынскага, «Сьцяг індустрыялізацыі» і інш.

Мандат на канфэрэнцыю атрымалі таксама паасобныя цэхі швэйнай фабрыкі «Кастрычнік»—закройны, шоўкавай істужкі, камсамольскай істужкі, першы агрэгат і другой істужкі.

З абутковых фабрык атрымалі мандат з правам рашаючага голасу менская абутковая і гомельская фабрыка «Праца». Пазбаўлена мандату віцебская абутковая фабрыка імя Лекерта, права рашаючага голасу атрымалі паасобныя гаспадарча-разрахунковыя брыгады фабрыкі, паказаўшыя ўзоры барацьбы за якасьць: тав. Камарава і Дольніка.

Саюзу каапэрацыі і дзяржгандлю прадстаўлена 25 мандатаў з правам рашаючага голасу. Заваяваў мандат магазын № 1 Віцебскага ЗРК, які арганізаваў грамадзкую заслону з 6 чал., затрымаў нядобраякасных тавараў на 9.000 руб. і не дапусьціў у продаж 500 пар нядобраякасных дзіцячага абутку. Прадастаўлен мандат таксама праматарнай базе віцебскага ЦРК, якая прымала ўдзел у паходзе за паляпшэньне якасьці. З гомельскіх каапэрацыйных арганізацый атрымаў мандат магазын № 1 скур'аб'яднаньня БКС, які здолеў уцягнуць рабочых у барацьбу з бракам.

На канфэрэнцыі прысутнічаюць прыбыўшыя ў Менск рэдактар газэты «Снабжение, кооперация и торговля» тав. Нодэль, старшыня ЦК саюзу работнікаў каапэрацыі і гандлю тав. Мароз, прадстаўнікі ЦК саюзу гарбарнай і швэйнай прамысловасьці т. т. Ягорава і Брэгман.

На канфэрэнцыю прыбылі таксама прадстаўнікі каапэрацыйных арганізацый і спажыўпоў Заходняй Вобласьці—3 чал., Масквы—5 чалавек.

т. ЯРМАКОЎ, дэлегат канфэрэнцыі па якасьці ад швэйнай фабрыкі імя Валадарскага

Дзеньнік канфэрэнцыі

На ранішнім пасяджэньні (10 красавіка) канфэрэнцыі былі заслуханы даклады Белскураб'яднаньня (тав. ЭФРОМАСКАГА), ЦП саюзу гарбароў (тав. ЛЕВІНСОНА), Белкаапсаюзу (тав. ВЕРБЫ), ЦП саюзу работнікаў каапэрацыі і дзяржгандлю (тав. КАЦНЭЛЬСОНА).

Пачаліся спрэчкі, якія будуць праходзіць адразу па ўсіх дакладах. На ранішнім пасяджэньні ў спрэчках выступілі т. т. ЗАЙЦАВА (швэйная фабрыка імя Валадарскага), УГУРЭЦ (абутковая фабрыка імя Лекерта, Віцебск) ГЕТЭЛЬМАН (Гомельскі ЦРК).

З вялікай увагай канфэрэнцыя выслухала выступленьне старшыні ЦК саюзу работнікаў каапэрацыі і дзяржгандлю тав. МАРОЗА.

* * *

У клюбе гарбароў, дзе адбываецца зьезд, арганізавана выстаўка бракаванай і добрай прадукцыі гарбарна-абут ковай і швэйнай прамысловасьці з пералічэньнем канкрэтных дэфэктаў браку.

Даць спажыўцу добрую вопратку!

На вячэрнім пасяджэньні 9-га красавіка з дакладам аб барацьбе швэйнай прамысловасьці за якасьць прадукцыі выступіў дырэктар Белшвэйаб'яднаньня тав. Тэклін.

У пачатку дакладу тав. Тэклін адзначыў посьпехі швэйнай прамысловасьці БССР, якая з саматужнай вытворчасьці ператварылася ў буйную мэханізаваную галіну прамысловасьці. Швэйныя фабрыкі давялі выпуск прадукцыі з 14 млн. руб. у 1927-28 г. да 187 млн. у 1931 годзе і да 250 млн руб. у 1932 г. Мы дасягнулі,—гаворыць тав. Тэклін,—раду посьпехаў у заваяваньні тэхнічна-эканамічнай незалежнасьці. Закройныя машыны, якія дагэтуль увозіліся з Амэрыкі, зараз выробляюцца ў тэхнічных майстэрнях Белшвэйаб'яднаньня. Гэтыя майстэрні выробляюць значную колькасьць складаных частак.

Спыніўшыся на пытаньні аб якасьці, дакладчык падкрэсьлівае, што да гэтага году швэйная прадпрыемствы аддавалі мала ўвагі якасьці прадукцыі.

Дабіліся значных посьпехаў у паляпшэньні якасьці фабрыкі «Кастрычнік», імя Валадарскага і імя Крупскай. Яны атрымалі права рашаючага голасу на канфэрэнцыі. Плятуцца ў хвасьце фабрыкі: «Сьцяг індустрыялізацыі» і імя Дзяржынскага—самыя буйныя прадпрыемствы БССР. Кіраўніцтвы гэтых фабрык, каб апраўдаць дрэнную работу, спасылаюцца на «аб'ектыўныя» прычыны, — быццам ім даюць мала часу для вырабу таго ці іншага асартымэнту. Гэтыя спасыланьні ня вытрымліваюць ніякай крытыкі. Гомельская фабрыка «Камінтэрн» за 44 мінуты выпускае добраякасныя штаны, віцебская фабрыка «Сьцяг індустрыялізацыі» траціць на гэта 54 мінуты і дае дрэнную прадукцыю. Справа тут не ў «аб'ектыўных» прычынах, а ў канцэнтрацыі ўвагі фабрычных арганізацый на пытаньні якасьці, у мабілізацыі мас на барацьбу з бракам.

Уцягнуць у барацьбу за якасьць масы рабочых, наладзіць жорсткі кантроль рублём над якасьцю работы, пакончыць з абязьлічкай у браку, пры цягнуць да гэтай справы шырокія колы каапэрацыйных работнікаў і спажыўцоў, — вось задачы усёй нашай грамадзкасьці.

З судакладам выступіў прадстаўнік ЦП саюзу швэйнікаў, тав. Райзін, які адзначыў, што прафарганізацыі швэйных прадпрыемстваў дагэтуль слаба змагаліся за якасьць прадукцыі. У далейшым прафработа павінна быць перабудавана ў напрамку поўнага забесьпячэньня выкананьня якасных і колькасных паказальнікаў.

АРГАНІЗУЕМ ГРАМАДЗКІЯ АГЛЯДЫ САЦСПАБОРНІЦТВА

Трэцюю гадавіну сацспаборніцтва мільёнаў спаткаем выкананьнем і перавыкананьнем усіх паказальнікаў прамфінплянаў

Прапановы сталінцаў давесьці да кожнага рабочага, да кожнага ўдарніка

У «Правде» ад 6 красавіка надрукован ліст рабочых, работніц, інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу Маскоўскага аўтазаводу імя Сталіна да ўсіх рабочых, работніц, калгаснікаў і калгасніц СССР. У гэтым лісьце, які спаў зьместам і прапановамі набывае вялізарнае значэньне, рабочыя заводу імя Сталіна падводзяць вынікі трох год сацыялістычнага спаборніцтва.

— Гераічная барацьба рабочай клясы СССР, сацыялістычнае спаборніцтва мільёнаў зрабіла цуды, — пішуць яны ў сваім лісьце.

— Сацыялістычнае спаборніцтва — вялізарнае дасягненьне партыі і рабочай клясы — перамагло, дзякуючы кіраўніцтву Цэнтральнага Камітэту партыі на чале з тав. Сталіным.

— Роўна тры гады назад быў апублікован артыкул Ул. І. Леніна «Як арганізаваць спаборніцтва». Рабочыя «Красного выборжца» і Каменскай паравой фабрыкі зьвярнуліся з таварыскім заклікам да ўсіх рабочых: выступіць на барацьбу з прагульшчыкамі і дэзарганізатарамі, якія наносілі вялікія страты народнай гаспадарцы. Заклік выбаржцаў і каменцаў спаткаў магутны волгук у мільённых масах рабочых. Пачаўшы сацспаборніцтва масавым паходам супроць прагульшчыкаў і гультяёў, арганізуючы мільёны працоўных ва ўдарныя брыгады, рабочая класа, узброеная вопытам «сквозных» і пляцавых брыгад, грамадзкім «буксірам» таварыскай дапамогі, да трэцяй гадавіны сацспаборніцтва ідзе з разгорнутымі сьцягамі сустрочнага і зьменна-сустрочнага плянаваньня і гаспадарча-разрахунковых брыгад.

— Мы ня можам, таварышы, — пішуць сталінцы, — у гадавіну сацспаборніцтва — 29 красавіка — ня ўспомніць аб кіруючай і натхняючай ролі тав. Сталіна ў разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва. Яшчэ ў 1928 годзе тав. Сталін зьвярнуўся з прывітаньнем да рабочых Ярдаўскай мануфактуры і да рабочых «Катушки» у сувязі з перавыбарамі смаленскага гарсавету. У гэтым прыватным тав. Сталін з усёй сілай падкрэсліў значэньне сацыялістычнага спаборніцтва. У далейшым кожнае выступленьне тав. Сталіна было сыгналам для ўдарнага сацыялістычнага спаборніцтва на больш высокія ступені.

Паведамляючы аб сваіх посьпехах, ён тут указваюць, што «масавае сацыялістычнае спаборніцтва паміж цэхамі, брыгадамі і пасобнымі ўдарнікамі было мэтадам нашай работы. І іменна гэты ленінскі мэтад барацьбы забясьпечыў нам поўную перамогу».

— Не пералічыць усіх старонак гонару, славы, адвагі і геройства рабочай клясы СССР за тры гады пяцігодкі. Ленінская ідэя сацспаборніцтва, падхопленая масамі, стала той гігантскай сілай, якая перарабляе сьвет і стварае непераможную магутнасьць сацыялістычнага грамадзтва.

— Трэцюю гадавіну сацыялістычнага спаборніцтва мы сустракаем у адказьнейшы момант: мы набліжаемся да завяршэньня праграмы першай пяцігодкі за чатыры гады.

— Ленінская палітыка нашай партыі, якая праводзіцца на аснове шабывалай актыўнасьці мільённых мас, забясьпечыла нам перамогу сусьветна-гістарычнага значэньня. У нас поўнасьцю ліквідавана беспрацоўе, мы стварылі самую буйную ў сьвеце сельскую гаспадарку, мы ўзьнялі на вышэйшую сучасную тэхніку нашу машынабудаўніцтва, нашу мэталюргію, нашу каменна-вугольную прамысловасьць, мы пабудавалі моцны эканамічны фундамант, на якім здолеем паставіць грандыёзны будынак сацыялізму.

— Гэта робіцца на вачох усяго сьвету. Рабочая класа і працоўныя капіталістычных краін на прыкладзе кожнага дня бачаць, на якія вышыні ўзьнімаецца крэпна пралетарскай дыктатуры і ў якое бяздонье жабрацтва і голаду кідае іх панаваньне буржуазіі.

— СССР ідзе ад перамогі да перамогі. На адным шостай частцы зямной кулі з магутнай сілай разгортваецца сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце, растуць усё новыя і новыя гіганты сацыялістычнай індустрыі.

— А на іншых пяці шостых зямной кулі, дзе панае яшчэ капітал, пад уладзмі абвываюча крызісу гасаць домны і мартэны, закрываюцца фабрыкі і заводы, замараюць варштаты, і «беспрацоўныя» машыны, суды, паравозы зьнішчаюцца. Там з кожным месяцам расьце армія беспрацоўных, якая памірае з голаду. З кожным месяцам сотні тысяч і мільёны зруйнаванага сялянства коцяцца ў бяздоньне жабрацтва.

— У агні вайны шукае буржуазія выхаду з крызісу. На Ўсходзе — на палёх прыгвечанага Кітаю грукацяць гарматы інтэрвэнтаў. Міжнародны імпэрыялізм рыхтуе ваенны напад на сацыялістычную бацькаўшчыну міжнароднага пралетарыяту — на СССР, краіну перамагаючага сацыялізму. Заварушыліся, як чэрві ў брудзе, беларгвардзейцы. Паны Рабушынскія хочуць вярнуць старыя часы крывавай эксплёатацыі.

— Будзем-жа на варце! Узмацнім па пор бальшавіцкага наступленьня. Кожная наша перамога на фронце будаўніцтва роўназначна выйгранаму бою, кожны процант перавыкананьня праграмы, кожная домна, пушчаная ў тэрмін, кожная новая капальня, пушчаная ў эксплёатацыю, кожны з'эканомлены дзень у пуску новых фабрык і заводаў узмацняюць нашу магутнасьць. Выйдзем-жа на першамайскую дэманстрацыю апошняга году пяцігодкі з выкананымі і перавыкананымі прамфінплянамі.

Сталінцы ў сваім лісьце ўносяць рад прапаноў. Яны зварачаюцца да ўдарнікаў чорнай мэталюргіі, гарнякоў Данбасу, Кузбасу, Караганды, Падмаскоўнага басэйну — поўнасьцю выканаць свае заданьні. Яны зварачаюцца да рабочых і ўдарнікаў усёй прамысловасьці з патрабаваньнем — берагчы варштаты і машыны, аўладаць тэхнікай работы на новых мэханізмах і апаратах, арганізаваць спэцыяльныя рамонтна-праверачныя брыгады для догляду за абсталяваньнем і варштатамі, для папраджаньня заўчаснага іх зношваньня, узмацняць эканамічную незалежнасьць СССР, арганізаваць генэральную праверку выкананьня заводамі-пастаўшчыкамі заказаў для новабудоўляў, прымусіць гаспадарчыя органы выконваць заказы ў тэрмін, вызваліць бюракратаў, якія тармозяць ход вялікай будоўлі, абвясьціць рашучую барацьбу «очковтирателям», якія ашукваюць партыю і рабочую клясу.

— У той-жа час, таварышы, нам трэба праверыць і свае ўласныя рады. Па ўсіх прадпрыемствах — у саўгасах, калгасах, установах — АРГАНІЗУЕМ ГРАМАДЗКІЯ АГЛЯДЫ САЦСПАБОРНІЦТВА. Выкрыем і ачысьцім свае рады ад ліжа-ўдарнікаў. Арганізуем новыя ўдарныя брыгады імя трэцяй гадавіны сацыялістычнага спаборніцтва. Праверым, як пастаўлен улік работы ва ўдарных брыгадах, наколькі яны ажыцьцяўляюць 6 умоў тав. Сталіна. Агляды павінны паказаць, наколькі прамфінпляны з усімі іх колькасными і якаснымі паказальнікамі даведзены да кожнага рабочага, да рабочага месца. Агляды павінны ўзмацніць гаспадарчы разрахунак і ўкараніць яго там, дзе ён яшчэ ня ўведзен.

— Да IX зьезду прафсаюзаў падрыхтуем рапарты аб новых посьпехах сацыялістычнага спаборніцтва, аб уцяг неньні ў рады ўдарнікаў новых дзесяткаў тысяч рабочых.

— Наступная наша задача — эканоміць матар'ялы, у асаблівасьці мэталь і апал, дабіцца выцэйшых норм прадукцыйнасьці пры няўхільным паляпшэньні якасьці прадукцыі. Якасьць прадукцыі зробім галоўным вымяральнікам работы кожнага рабочага, кожнага ўдарніка, кожнай ударнай брыгады. Арганізуем на сваіх прадпрыемствах праверку палўнасьці сырцу і матар'ялаў, выявім нескарыстаныя матар'ялы, якія ляжаць мёртвым грузам і перадамо іх на тыя прадпрыемствы, дзе ў іх адчуваецца вострая патрэбнасьць, дзе яны могуць быць неадкладна пушчаны ў зварот.

— Ударнікі палёў, таварышы рабочыя і работніцы саўгасаў і МТС, таварышы калгаснікі і калгасьніцы! Аўладайце тэхнікай апрацоўкі зямлі па-новаму, як мы аўладаем тэхнікай работы на новых варштатах і машынах. Узбройвайцеся тэхнічнымі ведамі, укараняйце ў саўгасы і калгасы апошнія дасягненьні агранаміі, беражэце ма шыны і прылады вытворчасьці. Арганізуйце брыгады, як указаў ЦК партыі ў сваёй пастанове ад 4 лютага, разгарнеце ленінскае спаборніцтва за высокія тэмпы сяўбы, за высокую якасьць ураджаю. Арганізуем магутную перакліч саўгасаў, калгасаў, машына-трактарных станцый, фабрык і заводаў за высокія тэмпы, за высокую якасьць.

— Таварышы рабочыя, ударнікі жывёлагадоўчых саўгасаў! Станьце як адзін на барацьбу з бескаспадарчасьцю і ўсімі тымі недахопамі, якія ўказаны ў апошняй пастанове Саўнаркому, ЦК і Наркамзему аб рабоце жывёлагадоўчых саўгасаў. Памятайце аб тэй вялізарнай адказнасьці, якую нясеце вы перад рабочай клясай, перад Чырвонай арміяй, перад усімі працоўнымі нашай краіны за выкананьне пляну здачы дзяржаве жывёлагадоўчай прадукцыі.

— Таварышы! За тры гады калёны ўдарнікаў пакрылі сябе такой-жа нечуванай славай, як і калёны чырвонаармейцаў на палёх грамадзянскай вайны. Мы падтрымалі гонар ударнай брыгады сусьветнага пралетарыяту. Мы прымусілі нават ворагаў прызнаць нашы грандыёзныя посьпехі.

Але ўперадзе яшчэ больш адказныя задачы — яшчэ ня мала крэпасьцей, якія мы павінны ўзяць. Згуртуем свае рады, разгорнем баявыя сьцягі для ленінскага сацспаборніцтва. Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, яе правадыра тав. Сталіна рушымся ў новыя баі за пасьпяховае сканчэньне пяцігодкі за чатыры гады, за пабудову сацыялізму ў другой пяцігодцы.

***

Сёньня зьмяшчаем першы волгук на ліст сталінцаў — ад рабочых гарбарні «Бальшавік». Ударнікі «Бальшавіка» зусім правільна ацанілі ўсю важнасьць ліста сталінцаў і, прымаючы выклік на сацспаборніцтва, абавязаліся ажыцьцявіць усе прапановы, высунутыя сталінцамі.

Задача ўсіх фабрык і заводаў БССР, усіх ударнікаў і фабрычна-заводзкіх арганізацый адказаць сталінцам такімі-ж канкрэтнымі абавязацельствамі і поўным іх выкананьнем і перавыкананьнем.

ВЫКЛІК СТАЛІНЦАЎ ПРЫМАЕМ

Адказ рабочых „Бальшавіка" на адозву ўдарнікаў аўтазаводу імя Сталіна

Чырвонасьцяжная гарбарня «Бальшавік», выканаўшы прамфінплян ударнага кварталу 1930 году і дабіўшыся перамогі на ўсесаюзным конкурсе, атрымала пераходны сьцяг імя ЦОПСБ і 5.000 руб. для прэміраваньня лепшых ударнікаў. Пасьля гэтага заводзкія арганізацыі разгарнулі вялізарную работу, накіраваную на пасьпяховае выкананьне прамфінпляну трэцяга разгорнутага году пяцігодкі — году завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР. Прамфінплян мы выканалі датэрміново на 27 дзён па ўсіх паказальніках.

Уступаючы ў чацьверты, заключны год пяцігодкі, ударны калектыў чырвонасьцяжнага заводу ня здаў сваіх тэмпаў бальшавіцкай барацьбы за выкананьне пляну сацыялістычнага будаўніцтва. Прамфінплян першага кварталу 1932 году таксама выканан і перавыкананы па ўсіх паказальніках: у колькасным адлічэньні на 101,44 проц., у цэнавым — на 108,85 проц.; сабекошт зьнізкан у студзені на 7,84 проц., у лютым — на 3,5 замест нуля, прадукцыйнасьць працы ўзьнята ў студзені на 12,04 проц., у лютым — на 23,5 проц. пры росьце зарплаты ў студзені на 6,41 проц., у лютым — на 8,02 проц. За квартал мы з'эканомілі апалу 11,3 проц. Адыходаў скарысталі на 235.299 рубл., з якіх шэрсьці запрыходавана на 57.726 руб., пчаліны — на 17.365 руб., клею сталярнага — на 118.104 руб. — 78 тон, у тым ліку 27 тон для экспарту.

Завод у асноўным асвоіў апрацоўку новага віду скурсьырцу — сыпкія скуры, што значна зьмяншае голад абутковых фабрык на скуртавары.

Усё гэта дзякуючы бальшавіцкім мэтадам работы, штодзённай барацьбе за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, за паглыбленьне і пашырэньне сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва і вышэйшай формы сацспаборніцтва — гаспадарчага разрахунку — гэтага магутнага вагара ў выкананьні прамфінпляну.

«Самае каштоўнае ў сацспаборніцтве заключаецца ў тым, што яно робіць карэнны пераварот у поглядах людзей на працу, бо яно ператварае працу з заворнага і цяжкага ярма, якім яна лічылася раней, у справу гонару, у справу славы, у справу адвагі і геройства» Гэтыя словы тав. Сталіна сталі сьцягам ударнага руху і гэта адбылася на рабоце ўсяго калектыву нашага заводу.

Калі мы на 1 студзеня 1931 г. мелі 64.5 проц. ударнікаў, на 1 студзеня 1932 г. 92,1 проц., дык на 1 красавіка мы маем 95,2 проц. Два асноўных цэхі заводу зьяўляюцца ўдарнымі на 100 проц.

Асноўным рухавіком росту сацспаборніцтва і ўдарніцтва была канкрэтнасьць задач, якія пастаўлены перад кожным цэхам, кожнай ударнай брыгадай, кожным ударнікам. Гаспадарча разрахунковыя брыгады стругалёў першага і другога хромавых цэхаў зьяўляюцца перадавымі ў барацьбе за зьмяншэньне выдатканьня важу да стругальных машын, за эканомнае выкарыстаньне змазачных матар'ялаў, за паляпшэньне якасьці. Не адстаюць глейтоўшчыкі другога хромавага цэху, рамнчыкі першага хромавага цэху, качагары мэханічнага цэху і інш.

Ва ўсю шырыню была пастаўлена задача на што-б там ні стала перабудаваць усю парт. і праф.-масавую работу, перанесьці цэнтр цяжару ў цэхавое зьвяно — у цэх, брыгаду, у партгрупу — з тым, каб кожная рабочага і ўдарніка ўцягнуць у барацьбу за прамфінплян, за якасьць.

З бальшавіцкай упартасьцю мы ўзялі ся за перабудову ўсёй партмасавай работы, прычым мэтадам гэтай перабудовы было масавае сацыялістычнае спаборніцтва паміж цэхамі, брыгадамі і пасобнымі ўдарнікамі. Іменна гэты ленінскі мэтад барацьбы забясьпечыў нам перамогу.

Партарганізацыя заводу заўсёды падкрэсьлівала перадавую ролю камуністаў па вытворчасьці, ставячы перад кожным камуністам задачу — быць заўсёды ў перадзе. Камуніст Сосякін, які панаў пад ўплыў былога трацкіста Змудзяка і зрабіў спробу ўнесьці разлажэньне ў партгрупу брыгады лашчыльшчыкаў 2 хромавага цэху, быў выключан з партыі. Камуністы Асановіч, Білевіч і Дашкевіч, якія злоўжывалі парушалі працэсыпліну, былі выключаны з партыі. Камуніст Ліхтэрман, які прабаваў скарыстаць свой партбілет для таго, каб знайсьці сабе цёплае месца, быў выключан з партыі.

Але асноўнае — масавая работа, учэпістае ўсяго калектыву ў актыўную работу. Для гэтага мы правялі і правядзем масавую работу з пасобнымі групамі рабочых: старымі, кадравікамі, прэміраванымі ўдарнікамі, з работнікамі, з маладымі рабочымі і перад кожнай з гэтых груп ставяцца канкрэтныя задачы на канкрэтных вучастках вытворчасьці.

Выкананьне прамфінпляну, ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі праходзілі ў барацьбе з усякімі ўхіламі ад генэральнай лініі — з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай на цяпершнім этапе, з «левымі» загібамі і прыпрэнтывам да іх.

Калі некаторыя кіраўнікі жэлязнага цэху ў 1931 г. хацелі даказаць, што яны ня выконваюць свайго прамфінпляну па аб'ектыўных прычынах, партарганізацыя заводу своячасова па гэтым ударыла і растлумачыла рабочым усю бяглузьдзіцу такой пастаноўкі пытаньня. Калі пры перазаключэньні калдагавору на 1932 г. рабочы першага хромавага цэху Гаеўскі прабаваў даказаць, што тэма зьнізіць нормы і павялічыць зарплату, партарганізацыя здолела шляхам растлумачальнай работы выкарыстаць гэтыя рэакцыя настрой, і кожны рабочы зразумеў шкодлівасьць і нецярпімасьць такіх патрабаваньняў.

Выкананьне прамфінпляну праходзіла ў абстаноўцы ненарматыўнага забясьпячэньня заводу сырцом, замены аднаго віду сырцу другім, невыстарчальнага забясьпячэньня матар'ялам і кэмікатамі. Усё гэта дакажае, што барацьба была ня лёгкай і што толькі правільнае партыйкіраўніцтва пры актыўнай дапамозе ўсяго калектыву забясьпечыла дасягнутыя посьпехі.

Побач з посьпехамі мы маем рад хібаў. Яшчэ ня зжыты прагулы на неўгрунтаваных прычынах, хоць у параўнаньні з 1931 г. першы квартал 1932 г. даў значнае зьмяншэньне прагулаў (з 0,11 проц. да 0,05 проц.). Але гэтага мала — мы павінны давесьці прагулы да нуля.

На ўсе гаспадарча - разрахунковыя брыгады маюць эканомію матар'ялаў. І гэтым пытаньнем трэба сур'ёзна заняцца. Ня ўсе брыгады праводзяць зьменна - сустрочнае плянаваньне. Якасьць прадукцыі яшчэ не зьяўляецца асноўнай задачай чацьвертага, заключнага году пяцігодкі. Слабае ўцягваньне рабочых у справу аўладаньня тэхнікай вытворчасьці ставіць перад заводзкімі арганізацыямі вялікую задачу — за што-б там ні стала ахапіць усіх рабочых гурткамі па вывучэньні тэхнікі вытворчасьці.

Адказваючы на выклік рабочых маскоўскага аўтазаводу імя Сталіна, мы абавязваемся да 29 красавіка правесьці грамадзкі агляд становішча сацспаборніцтва і ўдарніцтва, агляд работы гаспадарча - разрахунковых брыгад, паглыбіць гаспадарчы разрахунак у брыгадах і цэхах, выявіць ілжа-ўдарнікаў і вычысьціць іх з радоў сапраўдных ударнікаў і г. д.

Прыймаючы выклік рабочых аўтазаводу імя Сталіна і абавязваючыся выканаць усе тыя канкрэтныя прапановы, якія ёсьць у іх адозве, мы выклікаем усе прадпрыемствы БССР прыняць выклік сталінцаў і адказаць такімі-жа канкрэтнымі самаабавязацельствамі.

Рабочыя, работніцы, інжынэрна-тэхнічны пэрсанал гарбарні Бальшавік (абмеркавана і ўхвалена на цэхавых мітынгах 8 красавіка 1932 г.).

АГЛЯД ДРУКУ

СУПРОЦЬ НЕДААЦЭНКІ АДНААСОБНАГА СЭКТАРУ

(„За бальшавіцкія тэмпы"—Веткаўскі раён, „Камуніст"—Бабруйск)

Аднаасобны сэктар у Веткаўскім раёне складае 69 проц. усіх сялянскіх гаспадарак. Ліквідаваць яго ня можна. Але ў Ветцы не ня прыкмецілі мясцовая газэта «За бальшавіцкія тэмпы». Ня прыкмецілі і пасьля студзеньскай пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР, у якой сказана: «Аднаасобны сэктар у 1932 г. у БССР будзе яшчэ займаць у пасеве значнае месца, недацэнка чаго была-б палітычнай памылкай». Як-жа прагучэлі гэтыя словы ў Веткаўскім раёне, дзе 69 проц. аднаасобных гаспадарак? На жаль, яны там прагучэлі вельмі глуха.

Яшчэ 18 сакавіка веткаўская газэта «За бальшавіцкія тэмпы» пісала:

> «Паводле вестак Райзэ па аднаасобным сэктары створана страхавых фондаў: збожжавых 14 з пап. проц. пляну, тэхнічных — 1 проц., плян збожжавычыстні выкананы на 5 проц. па радзе сельсаветаў гэта работа зусім не распачата.
>
> Райзэ ня мае ніякіх матар'ялаў, як прапрацован плян сяўбы па сельсаветах, ці даведзен ён да паселішчаў. Райзэ нават ня ведае, ці даведзен плян сяўбы да купаваможных гаспадарак».

Ці ня ясна, што трэба было пабальшавіцку ўзяцца за падрыхтоўку да сяўбы ў аднаасобным сэктары. Але газэта «За бальшавіцкія тэмпы» пакуль яшчэ не паказала сваіх бальшавіцкіх тэмпаў. У наступных нумарох яна не разгортвае шырокай кампаніі па падрыхтоўцы аднаасобнага сэктару да веснавой сяўбы, абмяжоўваецца ўказаньнем, што «павінен быць зроблен рашучы пералом».

У нумары ад 27 сакавіка газэта «За бальшавіцкія тэмпы» канстатуе вялізарны прарыў у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы ў аграмаданным сэктары. Газэта прыводзіць факты і лічбы, якія крычаць аб гэтым прарыве. Але ні аднаго факту аб яшчэ большым прарыве ў аднаасобным сэктары газэта ня прыводзіць. У рэдакцыі газэты толькі і хапіла слоў, каб сказаць, што:

> «масавая работа па мабілізацыі бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў на падрыхтоўку да сяўбы праводзіцца далёка невыстарчальна».

Замест энэргічнай барацьбы за падрыхтоўку аднаасобнага сэктару да сяўбы, газэта пазычае ў веткаўскага райвыканкому казённае «благополучие». Замест таго, каб загаварыць бальшавіцкай мовай на сваіх старонках, газэта мямліць, не сказаўшы нічога выразнага. Замест таго, каб мабілізоўваць і арганізоўваць масу бядняцкую і серадняцкую аднаасобнікаў на падрыхтоўку да сяўбы, на выкананьне імі вытворчых пляноў, газэта адмахваецца агульнымі разважаньнямі, напрыклад «зрабіць пералом», «трэба ўзяцца» і г. д.

Пасьля пленуму ЦК КП(б)Б, які даў ясныя ўстаноўкі ў адносінах аднаасобнага сэктару, здавалася-б, газэта павінна была ўзяцца па-бальшэвіцку за аднаасобны сэктар. Але гэтага няма.

У чытача можа мінавоці ўзьнікнуць здзіўленьне: газэта называецца «За бальшавіцкія тэмпы», але гэтых тэмпаў яна не паказвае. Таварышы з веткаўскай газэты, ці доўга вы будзеце вызначацца над сваёй уласнай назвай? Ці доўга вы яшчэ будзеце чухацца пасьля зімовых нарэзаў? Вясна-ж на дварэ.

***

Калі веткаўская газэта разы два прагаварылася аб ісканьнях аднаасобніка, то бабруйскі «Камуніст» маўчыць зусім. У адносінах 60 проц. аднаасобных сялянскіх гаспадарак «Камуніст» прытрымліваецца прыпеву: «маўчаньне — золата».

Возьмем да прыкладу нумар газэты ад 29 сакавіка. У перадавым артыкуле «Да 5 красавіка завяршыць падрыхтоўку да сяўбы» гаворыцца аб калгасных брыгадах, аб пробных выездах і г. д. Ўсё гэта добра і патрэбна. Але дзе-ж 60 проц. бедняцкіх і серадняцкіх аднаасобнікаў, якія таксама павінны ўзарваць і засеяць вялізарныя плошчы зямлі? І ня проста засеяць, а засеяць ачышчанымі насеньнямі на ўгноенай глебе. «Бабруйскаму камуністу», як відаць, усё гэта не ў здагад.

«Бабруйскі камуніст» 2 сакавіка адкрыў «мітынг палёў». Ня будзем пагрыбіцца ў дэталі гэтага мітынгу, у якасьць яго праведзеньня. Аб гэтым павінна ісьці гутарка асобна. Адзначым толькі, што і гэтай формай зусім абыйдзен аднаасобны сэктар.

Замоўчваньне 60 проц. аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, ігнараваньне іх выцякае з недацэнкі аднаасобнага сэктару, які грае яшчэ вялізарную ролю ў выкананьні агульных пляна сяўбы.

Трэба запамятаць, што гэта недацэнка бязумоўна зьяўляецца грубейшай палітычнай памылкай газэт.

***

Апошні аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б заказтрыў «увагу партыйных, савецкіх і земельна-калгасных арганізацый на праведзеньне рашучай барацьбы з недацэнкай ролі аднаасобнага сэктару». Гэта дырэктыва адносіцца і да друку, які павінен быць застрэльшчыкам у барацьбе за яе ажыцьцяўленьне. Такое становішча, калі «ўсім неадкладнымі хоц падрыхтоўкі да веснавой сяўбы ў аднаасобным сэктары» (з пастановы пленуму ЦК) павінна быць ажыцьцёўлена.

Раённаму і нізавому друку ўжо час па-сур'ёзнаму ўзяцца за выкананьне дырэктывы пленуму ЦК, праводзячы гэту работу не «ад гуту і ў пэлым», як гэта робіць веткаўская газэта. Патрэбна сканцэнтраваць увагу на асобных, важнейшых участках: ачыстка насеньня, угноеньне палёў, выкарыстаньне ўнутраных матар'яльных рэсурсаў, барацьба за мінімальны тэрмін сяўбы, бязьлітасна змагаючыся з кулаком і яго агентамі правымі і «левымі» апартуністамі.

Чагу засталося мала. Патрэбны бадзёрыя, бальшавіцкія тэмпы ў барацьбе за падрыхтоўку аднаасобнага сэктару да сяўбы. Наш друк павінен паказаць узоры гэтых бальшавіцкіх тэмпаў.

Б. ПАПОЎ

ЧАМУ ВУЧЫЦЬ СПРАВА НАСТАЎНІКА КАРМОВА

Рабкор у сваёй заметцы ў «Зьвязду» пісаў аб Кармове так: «Савецкая ўлада выкавала з Кармова рабочага-інтэлігента. Ён паходзіць з сям'і працоўных. Дзякуючы ленінскай нацыянальнай палітыцы т. Кармоў атрымаў вышэйшую адукацыю на сваёй роднай мове».

Рабкор мае рацыю. Былы настаўнік нараўлянскай сямігодкі Кармоў — адзін з многіх прадстаўнікоў рабочай моладзі, якім Кастрычніцкая рэвалюцыя шырока адкрыла дзьверы вышэйшай школы, адзін з тых, якімі папаўняліся кадры нацыянальных работнікаў культурнага фронту.

Паходзячы з сям'і працоўнага саматужніка, Кармоў з раньніх гадоў працаваў на найме краўцом. Вучыўся ў прафтэхшколе швейнай прамысловасьці, а потым на скалачэньні Віцебскага політэхнікуму, быў настаўнікам у Крыме. У 1928 г. паступіў па літаратурна-лінгвістычнае аддзяленьне БДУ. Пасьля выпуску ў 1930 г. працаваў настаўнікам у яўрэйскай сямігодцы ў Нароўлі.

Вось кароткая біяграфія Кармова. Восем гадоў фізычнай працы, вучоба і настаўніцтва.

І раптам, на так даўно Кармоў пакончыў жыцьцё самагубствам, бяссэнсоўна прабуючы гэтым даказаць сваю правату.

Партыя і рабочая класа рэзка асуджаюць. Усякае самагубства. Гэта ня наш спосаб апрацаньня. Самагубства знаходзіцца ў непрыкрымай супярэчнасьці з пралетарскай этыкай. Кармоў, прымаючы сярэдняю кіслату, правёў малодушна, бесхрэбетнасьць, ніварту пралетарскага інтэлігента. Пераўжны паступак Кармова павінен быць бязумоўна асуджан савецкай грамадзкасьцю.

Але гэта зусім не азначае, што мы не павінны цікавіцца абставінамі, пры якіх адбыўся даны выпадак, высьветліць прычыны, якія штурхнулі савецкага настаўніка на шлях самагубства.

Кармоў атруціўся пасьля таго, як раённая настаўніцкая канфэрэнцыя пазбавіла яго з работы і пазбавіць годнасьці настаўніка.

Ён абвінавачваўся ў вялікадзяржаўным шавінізьме, які праявіўся, паводле пастановы канфэрэнцыі, у выкладаньні грамадазнаўства на расійскай мове ў школе прамарцелі, у выступленьні на канфэрэнцыі таксама на расійскай мове і адмаўленьні гаварыць тут па-беларуску. Далей, Кармоў абвінавачваўся ў паклёпе на партыю, у сувязі з тым, што быццам у 1931 годзе на міжсаюзным сходзе, заявіў: «Партыя праводзіць беларусізацыю з наскоку, ад месячніка да месячніка. Нацыяльнага для партыі не зьяўляецца штодзённай справай, а кампаніейскай».

Кармову інкрымінавалася прымірэнцтва да антысэмітыму, сувязь з чужым элементам у выглядзе запрашэньня ў школу амэрыканскага буржуя для правядзеньня гутаркі з дзецьмі.

Нарэшце, Кармову прыпісвалася спроба дыскрэдытаваць кіраўніцтва раённу партыі ў форме абвінавачваньня ў п'янстве культпропу раённу т. Адасёва.

Вось сутнасьць абвінавачваньняў Кармова і матывы пазбаўленьня яго годнасьці настаўніка. Учынкі Кармова проста кваліфікаваліся, як вылазка клясавага ворага і контр-рэвалюцыянэра, які прабаваў «здаравць настаўніцтва ад кіраўніцтва камуністычнай партыі».

***

Сутнасьць усёй гэтай справы вымалёўваецца ў такім выглядзе. Вялікадзяржаўны шавінізм прыпісан на тэй падставе, што Кармоў выкладаў у вячэрняй школе па-руску і ня ўжываў у штодзённым жыцьці беларускай мовы.

Вядома, Кармоў, працуючы ў БССР, павінен быў імкнуцца да аўладаньня беларускай мовай. Дрэнна, што ён ня змог яшчэ ёю аўладаць. Незразуменьне гэтага пытаньня параджала з боку Кармова недацэнку значэньня беларусізацыі і нават у асобных выпадках, праяўленьне пэўных элемэнтаў шавіністычных настрояў. Але няўжо чалавек з падобнага роду, хаця і сур'ёзнымі памылкамі — ужо клясавы вораг, контр-рэвалюцыянэр?

Далей. Пры падыходзе да Кармова ніяк нельга было ня ўлічваць таго рашаючага факту, што гутарка ідзе аб чалавеку, які з дзяцінства гаварыў на яўрэйскай мове, скончыў прафшколу, політэхнікум і ўніверсытэт на сваёй роднай мове і працаваў увесь час у якасьці нацработніка ў школах Крыма і БССР. Няўжо Кармоў, аддаючы сябе рабоце на нацыянальным участку культурнага фронту, на справе не дапамагаў партыі ў ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі, разьвіцьці культуры сацыялістычнай па зьмесьце і нацыянальнай па форме?

Поўнае нежаданьне лічыцца з гэтай важнейшай акалічнасьцю, адсутнасьць дыфэрэнцыяванага падыходу да Кармова, як да яўрэйскага нацработніка дае падставу меркаваць у тых, хто кіраваў вырашэньнем справы, наяўнасьць недаацэнкі пытаньня работы сярод нацменшасьцяй і нават душэн мясцовага шавінізму. Гэта меркаваньне яшчэ больш пацьвярджаецца тым, што аналёгічнага-ж парадку грубая памылка ёсьць і ў самой рэзалюцыі канфэрэнцыі настаўнікаў.

Там сказана: «Настаўніцкая канфэрэнцыя Нараўлянчыны, выходзячы з вышэй прведзеных фактаў, рашуча асуджае вылазку вялікадзяржаўнага шавініста Кармова, адмяжоўваецца ад яго, як ад элемэнту, які праводзіць клясава-варожую ідэалёгію, і які варожа адносіцца да мовы нацменшасьцяй (?), прызнаючы панучай мовай расійскую вялікадзяржаўную (?) мову».

У гэтым пункце пастановы, перш за ўсё, ёсьць блытаніна ў тым, што беларуская мова (у ігнараваньні якой Кармоў як раз і абвінавачваўся) адносена да моваў нацменшасьцяй.

Па-другое, пастанова акрэсьлівае расійскую мову, як «вялікадзяржаўную». Падобнага роду «тэорыя» яшчэ раз пацьвярджае, што крытыка памылак Кармова вялася ў пэўнай ступені з пазыцый беларускага шавінізму. Адсюль становіцца зразумелым і тое, чаму да Кармова, які ведаў слаба і расійскую мову, пастаянна працаваўшага ў яўрэйскай сямігодцы і які толькі некалькі месяцаў праводзіў па сумяшчэньні локцы па грамадазнаўстве ў зьмешанай школе прамарцелі, прад'яўляецца патрабаваньне выкладаць на беларускай мове, а невыкананьне гэтага патрабаваньня безапэляцыйна кваліфікуецца, як праяўленьне вялікадзяржаўнага шавінізму.

Партыя праводзіць беларусізацыю не гвалтоўным шляхам, а мэтадамі перакананьня рабочых мас, арганізацыі шырокай палітычна-выхаваўчай работы. Прымусовыя меры беларусізацыі могуць быць ужыты толькі ў адносінах апарату, да тых, хто працуе ў ім.

Кастрычніцкі пленум ЦК КП(б)Б 1930 г. у сваёй рэзалюцыі па нацыянальным пытаньні падкрэсьліў, што «беларусізацыя рабочых мас ня можа ніякім чынам праводзіцца прымусовым шляхам. Яна можа быць угрунтавана толькі на сьвядомым добраахвотным удзеле рабочых у гэтай справе... Патрэбен дыфэрэнцыяваны падыход да розных пластоў рабочых, што маюць у сваім складзе і карэнных беларусаў, абрусеўшых і адыйшых ад ужываньня роднай мовы і расійскіх рабочых, якія маюць розную ступень падрыхтоўкі да вывучэньня беларускай мовы, і яўрэйскіх рабочых, у масе сваёй найменш падрыхтаваных, каб аўладаць беларускай мовай».

Зразумела, што да Кармова мы павінны прад'явіць значна большыя патрабаваньні ў вывучэньні мовы, чым да рабочага ад варштату. Але зусім відавочна, што пры вырашэньні справы Кармова параўлянскімі арганізацыямі дапушчана грубае парушэньне дадай пастановы ЦК КП(б)Б. Замест чулага, таварыскага, дыфэрэнцыяванага падыходу да Кармова, як рабочага і пацработніка, ужыты груба-адміністрацыйныя мэтады, прыпыбеоўпчына, пытаньне вырашана з налёту.

У абвінавачых матар'ялах «клясава-варожы» твар Кармова, «анты-савецкі» характар яго павозін угрунтоўваецца галоўным чынам тым, што быццам Кармоў узьвёў паклёп на партыю сваёй заявай на сходзе ў 1931 г. аб правядзеньні партыяй нацпалітыкі насоскамі. Між тым, гэта абвінавачаньне зьявілася результатам простай несправэранасьці фактаў. Цэлы рад таварышоў, у тым ліку і сакратар раённай нацкамісіі, якія прысутнічалі тады на сходзе, сьцьвярджаюць, што абвінавачаньне напраўдзінае, што Кармоў у сваім выступленьні крытыкаваў кампаніейшчыну ў рабоце мясцовай нацкамісіі. Нават сам аўтар абвінавачаньня т. Вольфман, са слоў якога запісана фармулёўка ў пастановах райкому і канфэрэнцыі, павінен быў нам прызнацца, што запісана «подкладна», што Кармоў аб партыі паогул і не гаварыў, а крытыкаваў мясц

Пяцідзеньнік праверкі БС РСІ

У часе пяцідзеньніка забясьпечыць рэалізацыю рацыяналізатарскіх прапаноў

Мабілізаваць шырокую грамадзкасьць вакол задач пяцідзеньніка

Ва ўсім комплексе мерапрыемстваў, накіраваных на сыстематычнае паляпшэньне працы ўсяго дзяржаўнага апарату, работа бюро скаргаў мае асаблівае важаньне.

Тав. Сталін сказаў: «Рашучая і сыстематычная барацьба з коснасьцю, бюракратызмам, цяганінай у нашых апаратах зьяўляецца адной з істотных задач партыі, рабочай класы і ўсіх працоўных нашай краіны».

На даным этапе перабудовы працы па-новаму асабліваю важнасьць набывае ўзмацненьне дзяржаўнага апарату, прыцягненьне шырокіх колаў працоўных да ўдзелу ў кіраўніцтве дзяржавай.

У гэтых адносінах значную ролю адыгрывае як ЦКК-РСІ цалкам, так і бюро скаргаў.

Бюро скаргаў за мінулы час мае значныя дасягненьні ў справе паляпшэньня работы нашага апарату. Гэты дасягненьні трэба замацаваць і ў далейшым рашуча змагацца за зьнічэньне недахопаў у рабоце апарату. Для гэтага трэба ўважліва адносіцца да кожнага факту бюракратычных скажэньняў, прыцягваць вінаватых фактыі, даводзіць гэтыя праверкі заўсёды да канца. Усяму гэтаму павінен садзейнічаць распачаты пяцідзеньнік.

Вынікі пяцідзеньніка будуць залежаць ягто і ад таго, наколькі будзе мабілізавана вакол яго шырокая грамадзкасьць.

Тавы абавязак усіх партыйных, савецкіх, прафсаюзных арганізацый заключаецца ў тым, каб шырока разгарнуць работу па мабілізацыі рабочых, калгаснікаў і ўсіх працоўных на правядзеньне пяцідзеньніка бюро скаргаў.

М. ГАЛАДЗЕД.

Усім ЦП і РПС

Па тых вестках, якія ёсьць у ЦОПСБ, рад ЦП, гарпрафсаветаў, фабрычна-заводзкіх камітэтаў да гэтага часу ня ўключыліся ў правядзеньне ўсесаюзнага пяцідзеньніка праверкі і ўзмацненьня бюро скаргаў (паўком заводу імя Молатава, «Кастрычніка», «8 сакавіка»). Менскі ГПС уключыўся толькі 8 красавіка.

ЦОПСБ катэгарычна прапануе пад персональную адказнасьць старшынь ЦП і гарПС разгарнуць работу па ўключэньні ў правядзеньне пяцідзеньніка бюро скаргаў на ўсіх прадпрыемствах, па арганізацыі пастоў РСІ, вярбоўцы добраахвотнікаў, дапамозе рабоце РСІ, увязваючы гэту работу з выкананьнем гаспадарча - палітычных задач, вызваленьнем канкретных носьбітаў бюракратызму ў прафсаюзным, савецкім і казначэйскім апаратах. Ліквідаваць цяганину ў рэалізацыі рабочых рацыяналізатарскіх прапаноў, паказаў, даных у часе перавыбараў фабрычна-заводзкіх камітэтаў.

Там, дзе да гэтага часу не абгаворваны задачы, якія стаяць у часе пяцідзеньніка, безадкладна абгаварыць на цэхавых, брыгадных і агульных сходах.

Старшыня ЦСПСБ РЫЖОЎ.

У Барысаве

БАРЫСАЎ. (Белта). На прапазыцыю пяцідзеньніка ў Барысаве будуць скліканы шырокія сходы рабочых буйных прадпрыемстваў па пытаньнях далейшай работы бюро скаргаў і замацаваньня актыву РСІ на прадпрыемствах.

Па лініі камсамольскіх арганізацый склікаецца агульна-гарадзкая нарада лёгкай кавалерыі па пытаньні сумеснай работы з РСІ, а таксама арганізацыі масавага рэйду лёгкай кавалерыі разам з рабкорамі і актывам РСІ бюро скаргаў.

Завербавана 50 чал. у актыў РСІ

Пяцідзеньнік агляду бюро скаргаў на заводзе імя Варашылава праходзіць пад кутом погляду барацьбы за якасныя паказальнікі прадукцыі, за перавыкананьне праграмы. У агляд бюро скаргаў уключыліся рабочыя, работніцы—ударнікі. Арганізаваны 4 брыгады па праверцы фінансаў, сацыяльна-бытавых умоў рабочых і інш. Завербавана 50 чал. для ажыўленьня работы бюро скаргаў.

На цэхах праведзены сходы рабочых аб значэньні пяцідзеньніка, выпушчаны сьпэцыяльныя лёзунгі ды газеты.

6 красавіка партакалектыў заслухаў даклад пасла РСІ аб ходзе работы пяцідзеньніка, у якім былі даны ўказаньні ўсім цэхкомам і цэхпартячэйкам аб мабілізацыі ўдарнікаў у актыў РСІ.

Варашылаўцы прынялі выклік заводу «Бэшкар» і адначасова выклікалі на сацыялістычнае змаганьне завод «Бальшавік» па наступных пунктах: стопроцантны ахоп рабочых падпіскай на «сацыялістычны чырвонец», арганізацыя брыгады па мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, уцягненьне ня менш 10 чал. у актыў РСІ.

Вальфсон.

Слухачы... пастанавілі...

Бюро скаргаў пры капыльскай РСІ вусім не працавала. За тры месяцы ня было ні аднаго пасяджэньня, не разгледжана ні адна скарга з удзелам працоўных мас калгаснікаў. Бюро скаргаў адарвана ад шырокай грамадзкасьці. І зарэз, у часе правядзеньня пяцідзеньніка, таксама няма ніякай работы.

Прэзыдыум рэйннай кантрольнай камісіі абмежаваўся толькі вынясьненем пастановы аб уключэньні ў пяцідзеньнік і на гэтым паставіў кропку. Ніхто нават і ня думае мабілізаваць вакол гэтай работы шырокія працоўныя масы, камсамол, прафсаюзы, грамадзкіх інспэктароў, «лёгкую кавалерыю».

Трэба, каб зараз-жа раённыя арганізацыі разгарнулі масавую работу з прыцягненьнем у правядзеньне пяцідзеньніка шырокіх працоўных мас.

П.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ЗМАГАЦЦА ЗА РАЗЬВІЦЬЦЁ І АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАЕ ЎМАЦАВАНЬНЕ С.-Г. АРЦЕЛІ

Рашуча перамагаць супраціўленьне клясавага ворага і яго агентуры

Гаспадарчае становішча часткі калгасаў у Сіроцінскім раёне і ступень выкананьня пляну калгасамі засьпкі насеньня фондаў сьведчыць аб тым, што барацьба ў гэтым раёне за арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў і падрыхтоўку да трэцяй бальшавіцкай весны праводзіцца слаба.

Гэта задача ў радзе парт'ячэек прадастаўлена самапёку. У разультаце гэтага ў многіх калгасах не арганізаваны ягто да гэтага часу вытворчыя брыгады. Ня больш як у адной трэці ўсіх калгасаў складзены фінансававытворчыя пляны.

Выкананьне пляну па засьпіты насеньня паводле вестак на 1 красавіка характарызуецца наступным. Па аўсе — 107 проц., ячмені — 99,2 проц., іншых яравых культурах — 65 проц., па ільнасемі — 55,6 проц., бульбе — 50,7 проц. Значна горш справа стаіць з засьпікай насеньня кармовых траў. Улічваючы тое, што Сіроцінскі раён па сваім гаспадарчым напрамку сьпэцыялізуецца ільнаводчым, са значнай удзельнай вагой разьвіцьця жывёлагадоўлі, дык становішча выкананьня пляну засьпікі ільнасеньня і кармовых культур вельмі дрэннае.

«Зьвязда» ў апошніх лічбах лютага адзначала рад сур'ёзных недахопаў у рабоце раённай партарганізацыі па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў і падрыхтоўцы да пасоўнай кампаніі. Аднак, належнага зруху ў гэтай справе ня ма і дагэтуль. Абмежаваліся тым, што вылучылі камісію для праверкі фактаў і на гэтым уся справа была скончана. Пазасобныя раённыя работнікі ў адказ на сьпічалы «Зьвязды» бяспрынцыпна заявілі: «Гэтыя факты старыя і ім даўно вядомы». Хіба справа ў тым, што вядомы ці невядомы факты, хіба-ж у гэтым прынцыповасьць? Задача заключаецца ў тым, каб мабілізаваць партыйную арганізацыю і калгасныя масы па ліквідацыю гэтых недахопаў.

Пазасобныя калгасы раёну засьмечаны яўна кулацкім элемэнтам, якія ў свой час мелі па 80-100 га зямлі. Старшыня працёлны калгасу імя Сталіна (Шагаранскі сельсавет) Шклін падтрымлівае цесную сувязь з кулацкай сям'ёй і спатуваньні раскулачаным асобам адностроўваецца ў яго дзейнасьці. У ліку членаў калгасу «Чырвоны пуцілавец» (Шумілінскі сельсавет) знаходзяцца такія тыпы, як Лазоўскі 6 арандатар бойнага маёнтку, Гураў Кузьма, які меў каля 40 гэкт. зямлі, і інш. Кулацкія элемэнты ў раёне разьвязваюць шалёную агітацыю супроць прыёму ільнаў пасеву, галоўным чынам пасеву тэхнічных культур. У выніку слабай масавай работы ў калгасах і пераважнай барацьбы з кулацкімі тэндэнцыямі пазасобныя калгасы пры абмеркаваньні пляну пасеву прымалі пастановы «плян прыняць пры ўмовах, калі дадуць насеньне».

У раёне вельмі слаба адчуваецца арганізуючая роля МТС. Ле кіраўніцтва ў асобе дырэктара Малашонка больш займаецца самахвальствам, «онтаратэльствам», чым практычнай работай па падрыхтоўцы да весны сяўбы. У калгасах, якія абслугоўваюцца МТС, вытворчыя брыгады складзены фармальна, брыгады на вечаючы ды нічыя. У сваю чаргу Кармоў пачаў распаўсюджваць сярод асобных настаўнікаў чуткі аб п'яньстве Адасёва і заявіў нават, што нібы Адасёў на настаўніцкай канфэрэнцыі рабіў даклад у п'яным выглядзе. Настаўнікі пацьвярджаюць факты высьмейваньня Кармова з боку Адасёва, у прыватнасьці з повазу жаданьня Кармова чытаць лекцыі на тэму аб злучэньні Масквы з Волгай. На канфэрэнцыі Адасёў назваў Кармова «балястам» і г. д.

Нельга прайсьці міма таго факту, што Адасёў у сваім лісьце ў бюро райкому, у блытаных туманных выразах, як, між іншым, і ўвесь ліст у цэлым, намусьці лічыць необходным агаразіць сябе ад падазронасьці ў здольнасьці да помсты. Ён піша: «Нельга адказаць патэнцыяльную месьць адному супроць другога ў месцах працуючым работнікам. Непатрэбна займацца казуістычнай фабрыкацыяй думкі і характару чалавека. Я ніколі нікому ня мсьціў, ня ўмею гэтым займацца, а пагоды і дужа гэтага баюся, ды і гэта ня пры супча камуністу. Гэта вядзе да падсіжваньня, шпіянажу і другім гадасьцям, уплоць да спорчанасьці характару».

Адасёў займае найбольш непрымірымую пазыцыю да Кармова пры абгаварэньні пытаньня ў райкоме. Патрабаваньні асобных членаў бюро больш падрабязна высьветліць справу ён расцэньвае, як недавер'е да сябе, заяўляючы, што для яго матар ялу досыць». І што ён будзе «сваю думку праводзіць да канца».

Пры разглядзе справы Кармова не прамінулі зьвесьці свае асабістыя рахункі і некаторыя іншыя. Напрыклад, у ліку абвінавачэньняў выступаў настаўнік Дарасінскі, якога Кармоў выкрыў за зьбіеньне дзяцей, што пацьвердзілася. Хто такі Дарасінскі відаць хадя-б з таго, што ён выкінут з камсамолу за адмаўленьне зьвяцца на пробкай мабілізацыі. Другому «абвінавачэньню» Падбярэзнаму Кармоў у свой час прыпісваў алтысэмітызм і г. д.

Атмасфэра склокі і цкаваньня магла быць непрымечанай толькі з прычыны адсутнасьці самакрытыкі і грубага націзку на зыход справы.

Прадстаўнікамі райкому на канфэрэнцыі была дана яўна направільная ўстаноўка, што быццам абвінавачаньне ў п'яньстве Адасёва зьяўляецца спробай дыскрэдытацыі ўсяго райкому і нават раённай партарганізацыі. У сувязі з гэтай «устаноўкай» справа набыла проста анэкдатычны характар. Адзін з «абаронцаў» аўтарытэту партыі дадумаўся вынесьці пытаньне аб п'яньстве Адасёва і назваць яму міжнародны характар. У выступленьні нейкага Сакалова мы чытаем: «Зрабіць паклёп на сябра Камінтэрну—значыць зрабіць гэты паклёп на ўвесь Камінтэрн (п'яньства) бяз усякай прычыны».

Які ўчыстлёт мысьлі! Якія маштабы! З гэтага часу Кузьма Пруткоў у сваіх афарызмах безвазьлёна пабіт.

Як бачыце, з такога роду, мякка кажучы, «абагульненьнямі» мы ў справе Кармова сустракаемся ўжо неўпярпьнню...

Толькі поўная адсутнасьцю самакрытыкі можна вытлумачыць магчымасьць узьнікненьня такіх аргументаў контр-рэвалюцыйнасьці Кармова. У абарону Кармова не раздаўся ні адзін голас, ні адной прапановы больш падрабязна праверыць абвінавачаньні, зьмякчыць пакараньне. А вось зараз многія мясцовыя настаўнікі заяўляюць, што лічаць і лічылі пастанову няправільнай.

«Закручваньне гайкі» ягтчэ больш узмацнецца пасьля таго, як Кармоў атрыціўся. На зьлёце ўдарнікаў, куды было вынесена пытаньне, той-жа самы Адасёў увосіць «дадатчак» да рэвалюцыі аб тым, што моў, усякі вы ступаючы ў абарону Кармова грае на руку клясаваму ворагу. Гр. Бушкілевай проста не дасцца слова, ня гледзячы на пратэст прадстаўніка нацкамісіі ЦВК БССР, які прысутнічаў на зьлёце. На другі-жа дзень на міжсаюзным сходзе з прамовай супроць Кармова выступае раённы пракурор т. Варановіч, перадвыкначае ўжо гэтым ход сьледзтва. На цукэрнай фабрыцы пракурор выступае на пытаньні аб нацналітыцы ў сувязі з справай Кармова афіцыяльны дакладчыкам. Да рэчы, сьледзтва і да гэтага часу ня скончана, заявы Кармова, даныя ў яго паказаньні, не праверены. «Кармоўчыка» пачынае гуляць у якасьці контр-рэвалюцыйнага ярлыка.

Ляснушчына жаданьне свяо-таго замаўчаць справу. І райвыканкома парасьветы і райпрафбюро «не дагаваліся» паведаміць у Наркамасьветы і ЦП саюзу аб самагубстве настаўніка. Хтосьці зьбіраўся даць матар'ял у друк, але таксама, мусіць, «забыў».

**

У справе Кармова дапушчана сканжэньне лініі партыі ў нацыянальным пытаньні і ў галіне адносін да савецкай інтэлігенцыі. У абодвух выпадках дапушчан яўны перагіб, які штурхнуў пралетарскага інтэлігента на самагубства. Гэта-ж справа сьведчыць аб зусім невыстарчальным узроўні са макрытыкі ў раёне.

Памылкі, дапушчаныя ў часе разгляду справы Кармова гаворыць аб адсутнасьці ў раду раённых работнікаў блытаніны ў пытаньнях нацыянальнай палітыкі (Адасёў, Стрэльчанка і інш.). (Нельга прайсьці міма блытаннага пункту пастановы і самога бюро райкому па справе Кармова. У першым пункце пастановы гаворыцца: «У барацьбе за пабудову сацыялізму партыя перамагае шалёнае супраціўленьне клясавых ворагаў, якія ў апошні час на грунце нашых дасягненьняў, як ніколі актывізуюцца, пралезлі ў рады ня толькі рабочай класы, але-ж і ў рады нашай партыі, знайшоўшы сабе апорны пункт у барацьбе з савецкай уладай, як больш небясьпечнае зьвяно на сёнешні дзень — гэта нацыянальнае пытаньне»).

Райкомам дапушчана памылка ў тым, што ім санкцыянавана выключэньне Кармова з настаўнікаў без выстарчальнай праверкі фактаў. Усе абвінавачаньні прыняты са слоў кожнага на веру. Ня была ўлічана абстаноўка склокі, у якой вырашалася пытаньне аб Кармове. Урокі справы Кармова не павінны прайсьці бясьследна. Глушыцелі самакрытыкі, любіцелі склок, цкаваньня і «неаглядных» абвінавачаньняў павінны атрымаць па заслугах.

Перад Нараўлянскай раённай партарганізацыяй паўстае задача — шырэй разгарнуць пралетарскую самакрытыку, даць адпор скажэньням лініі партыі ў адносінах да інтэлігенцыі, калі ўмець вывесьці узьніць сваю работу па аньяцыяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі, узмацніць барацьбу на два фронты, супроць ухілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі, супроць ухілаў у бок мясцовага беларускага і іншых шавінізмаў і прыніжэньня да іх.

Складаны нацыянальны пераплёт у раёне і шэсьць нацыянальнасьцей) прад'яўляе да Нараўлянскай партарганізацыі павышаныя патрабаваньні ў галіне культурна - нацыянальнага будаўніцтва, рашучага палепшэньня работы сярод нацменшасьцей, асобнай ільнасьці да спроб клясавага ворага насець нацыянальную варожасьць сярод працоўных мас.

Ня можа быць сумнеўнай, што Нараўлянская партарганізацыя і раённае кіраўніцтва, надаўна абнаўленае, па-бальшавіцку выправіць дапушчаныя памылкі, належным інтэрнацыянальнае выхаваньне працоўнага насельніцтва раёну.

М. Нароўль.

У АВАНГАРДЗЕ МАС

Запольская парт'ячэйка Плешчаніцкага раёну існуе толькі адзін год. На тэрыторыі сельсавету, які абслугоўваецца гэтай ячэйкай, знаходзяцца 7 калгасаў. За гэты год на аснове правільнай расстаноўкі партыйных сіл, разгортваньня масавай работы, рашуча змагаючыся супроць апартунізму, партыйная ячэйка дасягнула значных посьпехаў у справе арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, забясьпечыла сваячасовую падрыхтоўку да весьнавой сяўбы.

На вытворчых калгасных нарадах ягтчэ ў мінулым годзе прапрацавана пытаньне аб перазоўце розных галін вытворчасьці на зьвяльшчыну. Зараз ва ўсіх калгасах па асноўных галінах вытворчасьці зьвяльшчына ўведзена. Добра наладжан улік працы як на колькасных, так і якасных паказальніках. У асноўным ліквідавана абязьлічка.

Калгасы Запольскага сельсавету ўжо ў студзені месяцы поўнасьцю закончылі разьмеркаваньне даходаў і ўраджаю. Перад правядзеньнем гэтай работы партыйная ячэйка правяла рад вытворчых нарад, на якіх пры актыўным удзеле калгаснікаў былі абмеркаваны прынцыпы правільнага разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю. Большасьць калгасаў сельсавету выканалі і нават перавыканалі пляны загатовак. Толькі два калгасы недавыканалі загатоўчы пляны па 10 проц.

До 15 сакавіка ўжо ва ўсіх калгасах сельсавету закончан рамонт сельска-гаспадарчых машын і інвэнтару, створаны насенныя фонды, поўнасьцю ачышчана насеньне. Калгасы імя Валадарскага і Энгельса правялі пробны выезд у поле, які паказаў, што машыны, інвэнтар і цяглая сіла ў гэтых калгасах да весьнавой сяўбы гатовы.

Усё гэта ёсьць вынік таго, што парт'ячэйка па-бальшавіцку мабілізавала на падрыхтоўку да трэцяй бальшавіцкай весны шырокія масы калгаснікаў, бедняцкіх і сераднякоў —адказасобнікаў.

Чатыры калгасы ажыцьцявілі ўжо сабою дагавары на лёнсемі і гутчайшае выкананьне пляну весьнавой сяўбы.

Ячэйка арганізавала двухтыднёвыя курсы па падрыхтоўцы брыгадзіраў для палепшанай гаспадаркі. Створаны тры гурткі па аўладаньні агра-тэхнікай. Гурткі працуюць адзін раз у пяцідзеньку і добра наведваюцца калгаснымі актывістамі.

Недахопам у рабоце ячэйкі ў падрыхтоўцы да весьнавой сяўбы зьяўляецца тое, што ягтчэ ў некаторых калгасах сельсавету не закончана арганізацыя пастаянных вытворчых брыгад. Гэты недахоп павінен быць неадкладна выпраўлен. Кожная вытворчая брыгада павінна ведаць свой вучастак работы, кожны калгаснік павінен ведаць сваё месца ў барацьбе за пляны трэцяй бальшавіцкай.

К.

Пераключыцца на ўдарныя тэмпы работы

Падрыхтоўка да весьнавой сяўбы ў калгасах Пышнянскага сельсавету (Лепельскі раён) праходзіць надзвычай марудна. Гэта ў першую чаргу тлумачыцца тым, што партыйная ячэйка гэтага сельсавету да апошняга часу амаль зусім не займалася пытаньнем правільнай арганізацыі калгаснай вытворчасьці, не забясьпечыла канкрэтным агаранымным кіраўніцтвам ніжэйшыя вытворчыя зьвяньні.

У ячэйцы налічваюцца 22 камуністы. Пры ўмове правільнай расстаноўкі партыйных сіл, перабудовы сваёй работы па-новаму, ячэйка магла-б з посьпехам забясьпечыць сваячасовую і поўную падрыхтоўку калгасаў да весьнавой сяўбы. Аднак, замест таго, каб паставіць у цэнтр увагі ячэйкі арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, кіраўнікі ячэйкі былі захоплены пагоняй за дутымі процантамі калектывізацыі. Ужо пасьля апублікаваньня пастановы ЦК УсеКП(б) ад 2 жніўня, у ячэйцы была вынесена рэзалюцыя: «за час правядзеньня падрыхтоўкі і сьняткаваньня дня калектывізацыі, калектывізаваць населішчы Аўгустова і Навасёлкі».

Недахопам з боку кіраўніцтва ячэйкі арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў дала свае адмоўныя рэзультаты. У калгасах Пышнянскага сельсавету ня ўведзена зьдзельшчына, не наладжан улік працы, разьмеркаваньне даходаў і ўраджаю ня скончана (калгас «Чырвоная Зарэўе»). Работа па арганізацыі пастаянных вытворчых брыгад і падбор брыгадзіраў па сельсавеце не раскачалася. У пазасобных калгасах («Чырвоны прамень») значна зьніжаны нормы выпрацоўкі ў параўнаньні з лімітамі Калгасцэнтру. У гэтым-жа калгасе, з прычыны безгаспадарчасьці, ніядбайных адносін да працы плян асеньняй сяўбы недавыканан на 56 гэкт. Засталося нескошанымі звыш 50 гэкт. сенажаці.

Ніякай увагі ячэйка не аддавала пытаньню павышэньня ўраджайнасьці і таварнасьці калгасу. На асноўных збожжавых культурах — жыта, пшаніца, ячмень — ураджай хістаецца ад 3 да 4½ цэнт. Пляны здачы таварнай прадукцыі ня выконваюцца.

Калгасы гэтага сельсавету ягтчэ да гэтага часу ня маюць цьвёрдых пляноў пасеву. Збор насеньня характарызуецца наступнымі лічбамі: плян сушкі насенных фондаў па збожжы выкананы на 75 проц., па тэхнічных культурах — на 21 проц., па бульбе — на 47 проц., па кармовых травах — на 24 проц. Зусім не падрыхтавана насеньне кораплодаў. Ягтчэ горш стаіць справа са сенным страхавым фондам, — плян выкананы толькі на 9-10 проц.

Кіраўніцтва ячэйкі падышло да перабудовы партыйнай работы па-казённаму, не прыстасоўваючы гэтай работы да канкрэтных умоў калгасу. У калгасе «Усход» была арганізавана партыйная група, якой даручана абслугоўваць два калгасы. Вылучаны партарганізатары ня маюць належных указаньняў з боку бюро ячэйкі ў іх рабоце. Пастановы ячэйкі, як правіла, носяць агульны характар.

Парт'ячэйка неабходна перабудаваць у сваёй рабоце, правільна расставіць свае сілы, паставіўшы ў цэнтр увагі барацьбу за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Трэба неадкладна мабілізаваць усе свае сілы, каб забясьпечыць сустрэчу весьнавой сяўбы ў поўнай гатоўнасьці.

Галоўную увагу—нізавому зьвяну

Па асноўных паказальніках калгас «Расьсьвет - пераможца» (Жлобінскі раён) да весьнавой сяўбы падрыхтаваўся. Закончана арганізацыя пастаянных вытворчых брыгад, насенныя фонды ссыпаны сваячасова, насеньне поўнасьцю ачышчана. Сельска-гаспадарчы інвэнтар і машыны ў поўнай справнасьці.

Калгасная партыйная ячэйка, на аснове перабудовы сваёй работы па-новаму, па-бальшавіцку змагалася за правільную арганізацыю калгаснай вытворчасьці. Кіраўніцтва ячэйкі ўсьвядоміла, што тыя задачы, якія пастаўлены партыяй у галіне арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, могуць быць ажыцьцёлены пры ўмове канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва.

На адказных вучастках вытворчасьці (скотны двор, стайня і інш.) вытворчыя брыгады ўзначалены ўдаравымі камуністамі. На чале брыгады даярак працуе камуністка Станіпэўская А., якая за добрую працу на вытворчасьці, за арганізацыю правільнага ўліку прадукцыі малочнай гаспадаркі прамірвана. У брыгадах палявых работ, у кузьні і майстэрні ёсьць парт-арганізатары. Член партыі загагчык гаспадаркі т. Кавалёў выконвае абавязкі кіраўніка вытворчых нарад, якія працуюць рэгулярна пры актыўным удзеле калгаснага актыву. Гэтыя нарады адыгрываюць значную ролю ў арганізацыі калгаснай вытворчасьці.

Зараз у ячэйцы разгорнута работа па правядзеньні перабудовы партыйнай і масавай работы, па пераняцьню цэнтру пажару ле ў нізавое зьвяно вытворчасьці. У буйнейшых палявочых брыгадах арганізаваны партыйныя групы. Вылучаны партарганізатары ў сьвінагадоўчай ферме, жывёлаводчай брыгадзе і ў брыгадах трактарыстаў і пчаляроў.

Валюк А.

Аб прымусовым аграмаджаньні жывёлы

Пастанова Наркамзему і праўленьня Калгасцэнтру БССР

Ня гледзячы на неаднаразовыя ўказаньні партыі і ўраду, што на даным этапе калгаснага будаўніцтва асноўнай формай калгаснай гаспадаркі зьяўляецца арцель, радам раёнаў (Ельскі, Камарынскі, Койданаўскі і інш.) былі дапушчаны грубыя скажэньні статуту с.-г. арцелі, якія выявіліся ў прымусовым аграмаджаньні кароў і дробнай жывёлы калгаснікаў.

Гэтыя «лявацкія» спробы перакочыць праз арцельную форму калгаснай гаспадаркі, адміністраваньне і інш. спрыялі забою жывёлы калгаснікаў і тым самым аказвалі простую дапамогу клясаваму ворагу — кулацтву ў яго барацьбе супроць сацыялістычнай жывёлагадоўлі. «Толькі воралі калгасаў могуць дапушчаць прымусовае аграмаджаньне кароў і дробнай жывёлы ў пазасобных калгаснікаў» (з пастановы ЦК УсеКП(б) ад 26 сакавіка 1932 г.).

Каб забясьпечыць бездакладнае выпраўленьне скажэньняў, дапушчаных у пазасобных раёнах у аграмаджаньні жывёлы і забясьпечыць хутчэйшае ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсеКП(б) ад 26 сакавіка 1932 г., пастановы сакавіцкага абяднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б, Наркамзем і праўленьне Калгасцэнтру БССР, у дадатак і разьвіцьцё сваёй раней шай пастановы ад 29-III 1932 г., пастанавілі:

Абавязаць усе калгасаўцы і праўленьні калгасаў шырока растлумачыць ва ўсіх калгасах пастанову ЦК УсеКП(б) ад 26-III 1932 г. і ЦК КП(б)Б ад 3-IV 32 г. аб недапушчальнасьці прымусовага аграмаджаньня жывёлы (шляхам правядзеньня спэцыяльных сходаў, распаўсюджаньня выданых Калгасцэнтрам БССР 30.000 экз. лістовак, зачытваньня пастановы ў насьценнагазэце калгасаў і інш.). Выявіць выпадкі прымусовага аграмаджаньня жывёлы, выправіць дапушчаныя памылкі, бездакладна вярнуць аграмаджаную ў прымусовым парадку жывёлу. Асоб, якія будуць супярэчыць выпраўленьню перагібаў, прыцягваць да адказнасьці. Аднавіць выключаных з калгасаў калгаснікаў за незаконнае аграмаджаньне апошняю кароў.

У мэтах хутчэйшага выраўнаваньня задачы партыі ў тым, каб «у кожнага калгасніка была свая карова, дробная жывёла і птушка», прапанаваць райвы, калгасаўцам і праўленьням калгасаў:

Устанавіць да 25 красавіка г. г. лік гаспадарак, якія ня маюць у сваім карыстаньні жывёлы і арганізаваць практычную дапамогу калгаснікам у набыцьці імі маладняка ад адказасобнікаў, а таксама шляхам продажу маладняка калгаснікам з прыплоду бягучага году аграмаджанага стала калгасаў.

Сакрэтчыць калгаснікам у набыцьці як маладняка, так і дарослай жывёлы праз іншыя крыніцы (у жывёлагадоўчых саўгасах, у пазасобных сэктары), шляхам часовай пазыкі грашовых сродкаў, аказаньня дапамогі ў перавозцы жывёлы і ўсіляк перасякаць спробы перашкодзіць купці маладняка і дарослай жывёлы як у калгаснікаў, так і ў адказасобных сэктары.

Усямерна падтрымліваць ініцыятыву калгаснікаў па дадатковай мабілізацыі насеньня аўса, ячменю, траў, кораплодаў, па прасоўваньні сустрэчных пляноў па сілаваньні і інш. для дадатковага пашырэньня кармовай базы калгасаў у такім разьмеры, каб была забясьпечана жывёла на толькі аграмаджаная, але абавязкова і неаграмаджаная жывёла.

Любая з работай па забясьпячэньні кармамі аграмаджанай жывёлы, уже зараз аказаць усямерную дапамогу калгаснікам, якія адчуваюць патрэбу ў кармах для ўласнай жывёлы, шляхам арганізацыі загатовак і падрыхтоўкі пры дапамозе аграмаджаных сродкаў вытворчасьці (сячкарня, сілаасорка, рабочыя коні, вожка і г. д.) галіннага корму ў дакладнае набыцьцё кароў з боку вызначэньня частка кароў з ваяўных у калгасе і г. д., не аслабляючы адпачасова рашучых мер уцьцяйнасьці супроць расьцківаньня, разбазарваньня кароў у калгасах.

Пры арганізацыі выпасных плошчаў у калгасах і іх адпаведнай падрыхтоўцы абавязкова ўлічаць забясьпячэньне пашай ня толькі аграмаджанай, але і жывёлы, якая знаходзіцца ва ўласным карыстаньні калгаснікаў.

Унесьці адпаведныя паправкі ў вытворчыя пляны калгасаў на 1932 год і ўлічыць пры арганізацыі пасеўных плошчаў, у прыватнасьці, кармавой базы наогул, абавязковае забясьпячэньне кармамі ня толькі аграмаджанай, але і жывёлы, якая знаходзіцца ва ўласным карыстаньні калгаснікаў.

Арганізаваць абязгуўваньне жывёлы, якая знаходзіцца ва ўласным карыстаньні калгаснікаў, плян вытворчасьці, зоатэхнічным доглядзе, усялякі дабіваючыся падвышэньня прадукцыйнасьці і поўнага захаваньня маладняка.

У строгай адпаведнасьці з дырэктывай ЦК камплектаваньне стада калгасных таварных ферм і стада калектыўнай гадоўлі рабіць выключна шляхам гадоўлі і купкі маладняка і дарослай жывёлы, у прыватнасьці, шырока скарыстоўваць дырэктыву НКЗ, Калгасцэнтру і Дзяржбанку ад 5 красавіка 1932 г. аб крэдытаваньні набыцьця жывёлы для таварных ферм без прыпячэньня долевых укладаньняў калгасаў.

У зьвязку з напўнымі спробамі кулацкіх элементаў скарыстаць выпраўленьне ў радзе месц «лявацкіх» перагібаў і памылак, якія выявіліся ў прымусовым аграмаджаньні жывёлы, для расьцягваньня калгасных таварных ферм, там дзе аграмаджаньне было праведзена на аснове статуту с.-г. арцелі, пазбяраючы калгасаўцы і праўленьні калгасаў у необходнасьці ня толькі захаваньня, але ягтчэ большага ўмацненьня работы па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасных таварных ферм шляхам забясьпячэньня ў іх правільнай арганізацыі працы і поўнай ліквідацыі абязлічкі і ўкараненьня сакрэтнай зьдзельшчыны (ад літра малака, лепшага залоўваньня маладняка і г. д.), ужываньня лепшага догляду жывёлы, поўнага забясьпячэньня кармамі, пашамі, памяшканьнямі і г. д.

Абавязаць райвы і калгасаўцы пазбегнуць кіраваньня ўказаньнямі ЦК ад 3 красавіка:

«ЦК КП(б)Б абавязвае партыйныя і калгасныя арганізацыі забясьпечыць шырокае растлумачэньне колхазу калгаснікам значэньня пастановы ЦК, якая накіравана на ўсямерное ўмацаваньне с.-г. арцелі і рашучую барацьбу са скажэньнямі лініі партыі. Партарганізацыі павінны забясьпечыць сапраўдны кіраўніцтвам правядзеньне ў жыцьцё пастановы ЦК, мабілізаваўшы шырокія масы калгаснікаў на выкананьне асноўных задач пасеўнай кампаніі і арганізацыю калгаснай вытворчасьці, на ўмацаваньне калгасаў у іх арцельнай форме».

Наркамзем БССР РАЧЫЦКІ.
Калгасцэнтр БССР МІЦЬКОЎ.

Армейскі камсамол

ідзе ў радох перадавых барацьбітоў за аўладаньне ваенна й тэхнікай

Змагацца за далейшыя посьпехі

Тэхніка ў будучай вайне будзе адыгрываць надзвычай вялікую ролю.

«Мэталюргія, хэмія, электрыканасьць, радыё, лябараторыі, навуковыя інстытуты—усё гэта будзе мабілізавана на вайну, усё гэта будзе пастаўлена на службу ёй». (Варашылаў).

Капіталістычныя краіны ў ліхаманкавай падрыхтоўцы да вайны ўмацоўнена насычаюць свае арміі навейшымі тэхнічнымі сродкамі барацьбы. Лік самалётаў у 5 буйнейшых дзяржавах павялічыўся ў 35 разоў. Шырока разгортваецца матарызацыя і мэханізацыя ў капіталістычных арміях.

Рост вайсковай тэхнікі бязумоўна аказвае непасродны ўплыў на формы арганізацыі і на тактыку армій. У сувязі з разьвіцьцём тэхнікі мяняецца і характар бою. Тав. Фрунзэ аб гэтым пісаў наступнае:

«Вопыт імпэрыялістычнай вайны паказаў, якую вялізарную ролю будзе адыгрываць тэхніка па палёх будучых баёў. Разьвіцьцё авіяцыі і хэміі, газыё-справы і інш. адгрывае ў гэтых адносінах самыя шырокія пэрспэктывы. Вайна будучага ў значнай меры, калі ня цалкам, будзе вайною машын».

Посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва ў Савецкім Саюзе, індустрыялізацыя краіны стварылі магутную базу аснашчэньня тэхнікай нашай Чырвонай армії. Рост вайсковай тэхнікі ўскладняе кіраваньне войскамі ў бай і ўскладнае на кожнага байца задачу аўладаньня ёю, і ў першую чаргу аўладаньня сваёй асабістай зброяй. Кожны баец павінен дасканала ўладаць зброяй і трымаць гэту зброю ва ўзорным парадку.

Выходзячы з гэтага, трэцяя ўсеармейская нарада сакратароў парт ячэек паставіла, як адну з важнейшых задач партыйных і камсамольскіх арганізацый — барацьбу за аўладаньне тэхнікай.

Трэцяя ваенная канфэрэнцыя часьцей БВА адзначыла, што камсамольскія арганізацыі Акругі маюць цэлы рад узорных прыкладаў барацьбы камсамолу за аўладаньне тэхнікай. Камсамольцы Акругі з гонарам выконваюць ускладненыя на іх абавязкі РВС СССР. У цэлым радзе часьцей камсамольцы знаходзяцца ў перадавых радох па добрым выкананьні стрэльб, зьяўляюцца лепшымі спраўкамі. Камсамольцы многіх часьцей рэгулярна, раз у пяцідзёнку ў паказальным парадку вывучаюць тэхніку і ў дзень адначынку паладжваюць тэхнічныя бай. Камсамольцы №-га артпалка паставілі мэтай — дабіцца выдатнага стану конскага складу і гэты абавязак выканалі. Праз дзве дэкады на вывадцы коняй камандаваньнем палка і старойшым ветэрынарам коні камсамольцаў прызнаюцца ў вельмі добрым стане. Гэта папулярызуецца ва ўсім палку і па камсамоле падцягваюцца ўсе астатнія. Камсамольцы другой культроты 14 с. п. усе стрэльбы выконваюць на ўсе 100 проц.

Барацьба камсамолу за рэвалюцыйную сталёвую дысцыпліну таксама дае бліскучыя паказальнікі. 350 ячэек камсамольскай арганізацыі Акругі падыйшлі да сваёй канфэрэнцыі поўнасьцю ліквідаваўшы ў сваім складзе выпадкі правапарушэньняў.

На гэтых дасягненьнях армейскі камсамол не павінен спыняцца. Пытаньні барацьбы за цьвёрдую рэвалюцыйную дысцыпліну ў радох. камсамолу, за аўладаньне тэхнікай павінны заўсёды стаяць у цэнтры ўвагі.

У парадку сутаварыства вайсковых камсамольскіх арганізацый з грамадзянскімі арганізацыямі ЛКСМБ неабходна разьвіць шырокую работу па ваяізацыі працоўнай моладзі.

Федаровіч.

Цэлыя падразьдзяленьні без дысцыплінарных праступкаў

Падрыхтоўчая работа да перавыбараў камсамольскіх кіруючых органаў у часьцях № -скай Обскай справізвай дывізіі праходзіла пад знакам мабілізацыі камсамольскіх мас на выкананьне рашэньняў 3-й усеармейскай нарады сакратароў партячэек аб камсамольскай рабоце. Большая колькасьць ячэек падрыхтоўчую работу разгарнула своечасова. Былі выпушчаны спэцыяльныя нумары шматтыражак і насьценгазэт, прысьвечаных перавыбарам. У ротах праводзіліся гутаркі, вывешваліся лёзунгі і дыятрамы, якія давалі аналіз вайскова-палітычнай падрыхтоўкі камсамольтаў.

Дывізыйная камсамольская канфэрэнцыя адзначыла, што пралетчнае становішча ўсёй арганізацыі ўстойлівае і здаровае, што яна і надалей будзе рашуча змагацца за чыстату сваіх ленінскіх радоў, за тэмпы і якасьць баявой палітычнай падрыхтоўкі.

Камсамольскія арганізацыі ў сваёй большасьці зьяўляюцца застрэльшчыкамі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарництва і паказваюць узоры вайсковай дысцыпліны ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы.

3-я кульрота № палка за ўвесь навучальны год ня мае ніводнага дысцыплінарнага праступку. Умовы па стрэльбе камсамольцамі выкананы на 100 проц. Камсамольцы 3-й батарэі артпалка таксама ня маюць ніводнага дысцыплінарнага спагнаньня, пазітэнтні ўсвоены добра, па захоўваньні каня і зброі камсамольцы займаюць першае месца.

Побач з гэтым ёсьць камсамольскія ячэйкі, якія не дабіліся яшчэ пералому ў галіне пайменшага захаваньня рэвалюцыйна - вайсковай дысцыпліны.

Ня ўсе камсамольскія арганізацыі дабіліся 100 процантнага ахопу індывідуальным ударніцтвам. Праверка дагаворуў праводзіцца не рэгулярна, у выніку чаго паасобныя ячэйкі ня ведаюць эфэкту праведзенай работы.

Камсамольцамі праведена вялікая работа ў справе аўладаньня вайсковай тэхнікі. Па ініцыятыве камандаваньня дывізіі камсамольцамі тэхніка асвоена добра. Камсамольцы другой батарэі арганізавалі 2 тэхнічных групкі і імі ўнесена 15 кантроўных рацыяналізатарскіх прапаноў. Найбольш узорныя ў справе аўладаньня тэхнікі зьяўляюцца ячэйкі: 2-й кульрота № с. п. 4-й роты № с. п. і 1-й батарэі № арт. палка.

Пасьляхова праводзіцца работа камсамольскай арганізацыі ў справе папаўненьня сваіх радоў за лік рабочых і калгасьнікаў.

Аднак проба адзначыць, што работа па замацаваньні росту праводзіцца не выстарчальна. Не ва ўсіх часьцях дывізіі здавальняюча пастаўлена работа па марксыцка-ленінскім выхаваньні камсамольскіх мас, што зьяўляецца галоўнейшай задачай.

Кіраўніцтва камсамолам з боку палкавога палітапарату і партарганізацый у радзе выпадкаў носіць яшчэ агульны характар.

Дывізыйная канфэрэнцыя, дэтальна абгаварыўшы становішча камсамольскай арганізацыі, мабілізавала камсамольскія масы на далейшае выкананьне задач баявой і палітычнай падрыхтоўкі.

Зарубежны.

Ад кампаній перайсьці да штодзённай работы

Армейскі камсамол, зьяўляючыся часткай усяго ленінскага камсамолу, ня можа працаваць бяз шчыльнай сувязі з грамадзянскімі камсамольскімі арганізацыямі. Гэтай шчыльнай сувязі ў штодзённай практычнай рабоце мы яшчэ ня маем.

Гэта сувязь далёка ня палкам скарыстоўваецца для поўнага выкананьня пастаноў IX зьезду ЛКСМ, які патрабуе безадкладнага ажыцьцяўленьня задачы ўсеагульнага абавязковага навучаньня камсамольцаў, усваеньня кожным камсамольцам мінімуму агульных і галоўных чынам тэхнічных вайсковых ведаў.

Ня ўсе грамадзянскія камсамольскія арганізацыі паставілі пытаньне ваяізацыі на прынцыповую палітычную вышыню, а вайсковыя ячэйкі не ўзяліся яшчэ па-дзелавому за дапамогу апошнім. Многія вайсковыя ячэйкі не адчуваюць яшчэ адказнасьці за стан ваяізацыі ў суставарыскай ячэйцы.

Многія грамадзянскія ячэйкі ЛКСМБ вельмі мала займаюцца пытаньнямі мікзборавай работы.

Неабходна зрабіць рашучы пералом у пытаньні сувязі з грамадзянскімі камсамолам, перайсьці ад кампанейскай да сыстэматычнай работы. Яна павінна спрыяць уздыму баявой падрыхтоўкі армейскага камсамолу, яшчэ большаму павышэньню ініцыятывы вытворчых ячэек і ўзьняць якасьць вайсковай падрыхтоўкі на вытворчасьці і ў вёсцы.

ДВОСКІН.

Выканаць загад ПУР'а

Дывізійная канфэрэнцыя ЛКСМБ Беларускай дывізіі пастаўлена перад усімі камсамольцамі баявая задача — выканаць поўнасьцю загад ПУР'а аб стопроцантным усваеньні праграмы «на добра». Апошняя праверка палітпаняткаў паказала, што ў арганізацыі яшчэ ёсьць каля 6 проц. камсамольцаў, якія слаба ўсвоілі праграму.

Зараз разгорнута вялаўчая работа вакол выраўнаньня задачы, пастаўленай ПУР'ам. Камсамольскія ячэйкі правядуць вялікую работу па дапамозе адстаючым. Арганізуецца практычная дапамога малодшаму камандыру ў падрыхтоўцы да палітзанятках.

У працэсе праведзенай кастаноў XVII партканфэрэнцыі яшчэ больш узмацніць энтузіязм байцоў, лепшыя ўдарнікі-байцы ідуць у камсамол.

Імпэрыялісты прыступаюць да падзелу Кітаю

Праект стварэньня з Шанхаю „вольнага гораду"

ШАНХАЙ, 9. «Чайна прэс» паведамляе, што дзяржаўны дэпартамант НАЗШ супроць стварэньня «вольнага гораду Шанхаю», лічачы, што гэта супярэчыць дагавору 9 дзяржаў.

Па паведамленьні газэты пэўныя замежныя колы ў Шанхаі, уключаючы японскія, выкунулі плян стварэньня невялікай рэспублікі на тэрыторыі Шанхаю, якая па сваім тыпе будзе набліжацца да Данцыгу. Але замест таго, каб знаходзіцца пад пратэктаратам Лігі нацый, Шанхай будзе пад апекаю міжнароднага гаагскага трыбуналу. Гаагскі трыбунал павінен будзе пазначыць генэрал-губарнатара, а закладаючы сход будзе складзен напалову з кітайцаў, напалову з чужаземцаў. У закладаючым складзе месцы для чужаземцаў будуць прапарцыянальна размеркаваны паміж самімі чужаземцамі. Кітайская частка будзе выбрана кітайскімі плацельшчыкамі падатку, якія жывуць у Шанхаі, за выключэньнем аднаго кітайца, які будзе пазначан кітайскім урадам: «Вольны горад» павінен будзе ўключаць міжнародны сэтльмэнт, французкую канцэсію і тэрыторыю ў 20 міль, якая прылягае да сэтльмэнту і канцэсіі. Кітай павінен будзе адмовіцца ад сувэрэнітэту над тэрыторыяй Шанхаю. Кітайцы, якія пражываюць у «Вольным горадзе», павінны будуць адмовіцца ад кітайскага грамадзянства і перайсьці ў грамадзянства новай дзяржавы. Гэты праект прадугледжвае скасаваньне правоў экстэрытарыяльнасьці, прычым чужаземцы будуць падлягаць юрысдыкцыі судоў, арганізаваных у новай дзяржаве. Па чутках пляны гэтыя больш шырокія, але органы друку, блючыся рэпрэсій з боку уплывовых замежных фінансавых колаў, якія могуць закрыць газэты, баяцца публікаваць усе падрабязнасьці. Апрача «Чайна прэс» ні адна з газэт не публікуе паведамленьняў па гэтым пытаньні (ТАСС).

Японскі ультыматум Лігі Нацый

ТОКІЁ, 9. Па паведамленьні газэты «Асака Асахі» міністэрства замежных спраў разаслала інструкцыі ўсім паслом з тым, каб апошнія паведамілі членаў рады Лігі нацый з японскай пазыцыяй у адносінах майскай сэсіі Лігі. Калі рада Лігі нацый будзе па-ранейшаму настойваць на застасаваньні артыкулу 15-га па манчжурскім пытаньні, дык японскі ўрад адкліча японскіх дэлегатаў з рады Лігі.

Газэта тлумачыць, што адкліканьне японскіх дэлегатаў яшчэ не азначае выхаду Японіі з Лігі нацый; выхад залежыць ад далейшых паводзін Лігі нацый. Па словах газэты японскі ўрад аддае шмат увагі пытаньню аб выхадзе, улічваючы магчымасьць ускладненьняў. Падкрэсьліваецца, што адносіны Японіі з Францыяй і Англіяй значна палепшыліся і сталі «зусім нармальнымі», таму выхад зьяўляецца непажаданым, паколькі апошні нясумненна пацярпіў-бы за сабою пагоршаньне гэтых адносін. У міністэрстве замежных спраў падкрэсьліваюць рассылку інструкцыі, абыходзячы моўчкі ход і вынікі перагавораў, якія адбыліся ў сталіцах.

Вялікая бойка паміж кітайскімі і японскімі войскамі

ШАНХАЙ, 9. Амэрыканскі, французкі і італьянскі ваенныя аташе, якія выехалі на кітайскую лінію абароны ўздоўж фронту, паведамілі, што ў чацьвер паміж кітайскімі і японскімі войскамі ў раёне Взйкан адбылася вялікая бойка. Сутычкі меншых разьмераў адбыліся ў Юанышы каля Тайцану.

Што азначае эвакуацыя па-японску

ТОКІЁ, 9. Усе газэты ўказваюць, што міністэрства замежных спраў у выніку нарады з кіраўнікамі ваеннага міністэрства паведаміла Сігеміцу аб тым, што Японія гатова ўключыць у згоду аб перамір'і наступную японскую заяву: «Японія выказвае надзею, што мясцовыя ўмовы вакол, а таксама ў самым Шанхаі палепшацца настолькі, што стане магчымай эвакуацыя японскіх войск з кітайскай тэрыторыі».

У інструкцыях асабліва падкрэсьліваецца, што заява зусім не азначае абяцаньня эвакуаваць войскі, а толькі «выражае надзею на магчымасьць эвакуацыі». Пад эвакуацыяй мяркуецца адвод японскіх войск на тэрыторыю сэтльмэнту. У той-жа час Японія настойвае на ўключэньні ў згоду пункту, які-б паказваў, што Японія чакае, што пасьля заключэньня перамір'я адбудзецца канфэрэнцыя «круглага стала» для забесьпячэньня бясьпечнасьці Шанхаю.

2 МЛН. ФІНСКІХ МАРАК НА ПАДРЫХТОЎКУ ТЭРАРЫСТЫЧНЫХ АКТАЎ У СССР

Супольная дзейнасьць фінляндзкага генштабу з белагвардзейцамі

ГЕЛЬСІНГФОРС, 8. «Арбэйтэрбладэт» варочаецца да апублікаваных у мінулым месяцы у фінляндзкім «Сацыялдэмакрате» выкрыцьцяў цеснай сувязі генэрала Валеніуса з белагвардзейскім генэралам Куцепавым і яго тэрарыстычнымі групкамі і садзейнічаньня, аказанага Валеніусам у 1927 годзе, у бытнасьці яго начальнікам генштабу, у падрыхтоўцы тэрарыстычных актаў супроць дзяржаўных і палітычных дзеячаў СССР. Газэта указвае, што фінскі генштаб дагэтуль ня выступіў з абвяржэньнем, лічачы больш разумным маўчаць. «Ёсьць падставы мяркоўніць, — піша газэта, — што ў фінскім генштабе і цяпер сядзяць паны, што знаходзіліся там у часе прабываньня ў ім Валеніуса. Яны павінны былі быць асьвядомлены аб яго сувязях і супольнай канспіраційнай дзейнасьці з рускімі манархістамі.

Бідавочна, — заўважае газэта, — Валеніус лічыў, што можа весьці сваю ўласную замежную палітыку па прыкладзе Людэндорфа, у армії якога ён атрымаў сваё першае ваеннае навучаньне. На гэтыя свае мэты ён, відавочна, выдатраваў тыя 2 млн. фінскіх марак з бюджэту ваеннага міністэрства, у выдатканьні якіх камісія сойму дарэмна прабавала атрымаць справаздачу. Пасьля апошніх выкрыцьцяў, — піша далей газэта— становіцца зразумелым, чаму справаздача па гэтых расходах ня была прадстаўлена. Выкрыцьці робяць таксама зракумелымі тыя шматлікія паездкі ў Польшчу і ў іншыя прыможныя з СССР дзяржавы, якія (паездкі) часта рабіліся тагочасным начальнікам генштабу Валеніусам. Гэтыя паездкі ў свой час зьвярнулі на сябе ўвагу ўсяго друку, але засталіся, аднак, пакрытымі таямніцай».

Газэта таксама зварачае ўвагу на той факт, што нарады белазмігрантаў, тэрарыстаў адбываліся ў тым самым бела-эміграцкім клюбе ў Гельсінгфорсе, дзе, як вядома, у апошні час наладжвалі свае нарады лапуасцы.

Адзіны фронт рускіх меншавікоў з белагвардзейшчынай

БЭРЛІН, 1. Па паведамленьні «Вэльт ам абэнд» белагвардзейцы, якія пражываюць у Германіі, зьвязаліся з рускімі меншавікамі ў мэтах стварэньня адзінага фронту белагвардзейцаў і сацыял-дэмакратаў супроць Савецкага Саюзу. Для гэтага будзе апублікавана адозва да германскай сацыял-дэмакратычнай партыі, у якой апошняя заклікае далучыцца да гэтага фронту. Апрача таго газэта паведамляе, што ў Баварыі ў вялікага князя Кірыла адбылася канфэрэнцыя так званай «манархічнай рады», на якой прысутнічалі прадстаўнікі белагвардзейскіх калёній усіх краін. У прыватнасьці, у канфэрэнцыі прымаў удзел вядомы Бэрмант-Авалаў.

ВОДГУКІ ЭЎРАПЭЙСКАЙ ПРЭСЫ НА ПРАВАЛ ЛЁНДАНСКАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ

Германскія водгукі

БЭРЛІН, 8. Ва ўрадавых колах Германіі адносяцца да правалу Лёнданскай канфэрэнцыі чатырох дзяржаў, як да адпавядаючага іх чаканьням. Вінаватым у правале канфэрэнцыі германскія ўрадавыя колы лічаць Тард'е. Па іх думцы з яго боку было вялікай памылкай загадзя, пасьля папярэдніх перагавораў з Макданальдам, сьвяткаваць перамогу і разьлічваць на тое, што Германія і Італія проста пацьвердзяць франка-ангельскую згоду. Адначасова ўказваецца на тое, што Грандзі ў часе свайго учарайшага рашаючага выступленьня праявіў надзвычайную стрыманасьць, абмежаваўшыся толькі прапановай пасярэдніцтва для арганізацыі сумеснай канфэрэнцыі Прыдунайскіх краін з прадстаўнікамі чатырох дзяржаў.

Але нават гэта ўмеркаваная прапанова аказалася для Тард'е непрыемлемай. Германскія ўрадавыя колы спадзяюцца, што ў Жэнэве ўдасца або поўнасьцю праваліць плян Тард'е, або знайсьці такое вырашэньне, ад якога не пацярпіць інтарэсы Германіі ва Усходняй і Паўднёва-Усходняй Эўропе.

У германскіх палітычных колах лічаць, што «аздараўленьне» Прыдунайскіх краін магчыма толькі пры ўмове папярэдняга гандлёвых зносін з імі і ўцягненьня замежнага гандлю Германіі ў гэтыя зносіны (ТАСС).

Французкая прэса абвінавачвае Германію

ПАРЫЖ, 9. Праяўляючы стрыманасьць у адносінах да Італіі, друк увесь цяжар абвінавачваньня ў правале лёнданскай канфэрэнцыі пераносіць на Германію, амаль аднадушна адзначаючы і крытыкуючы заяву Бюлова, што ў выпадку катастрофы ў Цэнтральнай Эўропе Германія зможа застасаваць «натуральны тавараабмен» з апошняй. Аднак, частка ўплывовай прэсы выказвае надзею, што пазыцыя Германіі ў Жэнэве пасьля прэзыдэнцкіх выбараў стане больш уступчывай. (ТАСС).

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Сельгасмашыны

Завод Гомсельмаш за 5 красавіка выпусьціў 32 сіласарэзкі —106 проц. пляну, 16 сячкарань — 100 проц. пляну, 10 бульбамык — 116,3 проц. пляну і 5 канюшынасартовак — 147 проц. выкананьня пляну.

6 красавіка выпушчаны 32 сіласарэзкі — 106 проц. пляну, 16 сячкарань — 100 проц. пляну і 5 канюшынасартовак — 147 проц. пляну.

Дакладная мэханіка

Віцебская акулярная фабрыка за першую пяцідзёнку красавіка выпусьціла прадукцыі на суму 77066 тысяч руб., што складае 110,1 проц. выкананьня вытворчай праграмы.

На БелДРЭС'е

1 ая БелДРЭС за 5 красавіка выпрацавала 176 тыс. клв. гадзін. Максымум дасягнуў 9.500 клв., мінімум —6.500 клв., сярэдняе—7.300 клв.

6 красавіка выпрацавана 152 тысячы клв. Максымум дасягнуў 7.750 клв., мінімум — 5.500 клв., сярэдняе — 5.300 клв.

7 красавіка выпрацавана 168 тыс. клв-гадзін. Максымум дасягнуў 9.200 клв., мінімум — 5.500 клв., сярэдняе — 7.000 клв.

Швэйныя вырабы

Швэйная фабрыка «Сьцяг індустрыялізацыі» (Віцебск) за пяцідзёнку з першага па 5 красавіка выканала заданьне на 81,8 проц.

Будматар'ялы

Лесапільны цэх заводу «Спартак» за 6 красавіка расьпілаваў 77 кбм. сырцу, або 96 проц. пляну.

7 красавіка завод расьпілаваў 66 кбм. сырцу, або 82 проц. пляну. Бачарны цэх выпусьціў 6-га красавіка 715 камплектаў цэмэнтнай клёпкі, або 79 проц. 7 красавіка выпушчана 950 камплектаў, або 105 проц. пляну.

Папера

6 красавіка шклоўская папяровая фабрыка «Спартак» выпусьціла 10,4 тоны паперы, што складае 54,5 проц. пляну.

***

Папяровая фабрыка «Чырвоная зорка» за 6 красавіка выпусьціла 10,9 тон паперы, або 82,6 проц. Працавала толькі адна машына № 2.

Скура

За пяцідзёнку з 1 па 5 красавіка магілеўская гарбарня імя Сталіна выпусьціла прадукцыі на суму 35.454 руб., што складае 53, 2 проц. пляну.

***

За час з 1-га па 5 красавіка віцебская гарбарня выпусьціла прадукцыі на суму 78.364 руб., што складае 84,2 проц. пляну.

Арганізован штаб садзейнасьці камунальнаму будаўніцтву

У мэтах дапамогі ажыцьцяўленьню праграмы камунальнага будаўніцтва 1932 г., пры «Зьвязьдзе» арганізуецца ШТАБ САДЗЕЙНАСЬЦІ КАМУНАЛЬНАМУ БУДАЎНІЦТВУ з наступных таварышоў: ГАРЫНА, ПАПОВА («Зьвязда»), ШПЭКТАРАВА і МЭЙРОВІЧА (гарком КП(б)Б), ВАЛОДЗЬКА, ПІНХАСІКА (гарсавет), КЕНІГА і ДАНІЛОВІЧА (гарКК-РСІ), ШУЛЬКІНА (ГСПС), АКСЮЧЫЦА (НК Камунальнай гаспадаркі), ЮДЗІНА (ЦП саюзу гарадзкіх прадпрыемстваў), ПЯТРОВІЧА (Дзяржплан), АБРАМСОНА (НКФ), ЛЕВІНА (Белжылсаюз), КАВАЛЕВА (ЦСПСБ), МОДЛІНА (гаржылсаюз), ФІША (працаўлектыў Менбуду), ЛУНГІНА (рабочы Менбуду), ДУБОЎСКАГА (рабочы трэсту парку), упаўнаважанага НКШЗ і прадстаўніка адзелу забудовы камгасу.

Першае пасяджэньне штабу адбудзецца 13 КРАСАВІКА, А 8 ГАДЗ. УВЕЧАРЫ ў памяшканьні рэдакцыі «Зьвязды» (Савецкая, 63, трэці паверх). У парадку дня — даклад загадчыка камгасу тав. ПІНХАСІКА аб камунальным будаўніцтве. Явка пералічаных таварышоў абавязкова.

Запрашаюцца прадстаўнікі ЦЗЦ, фабрыкі-кухні, аўтакатычнай тэлефоннай станцыі, Зьвязу, заводу стандартных домаў, цэху гранітных труб заводу імя Мікіткіна, УВГ, Вадаканалу, саюзу кардонкаў, тросту будматар'ялаў, рэдакцый газэт і інш.

Падарожжа Стымсона ў Эўропу

НЮ-ЁРК, 8. Дзяржаўны сакратар Стымсон выехаў у Эўропу. Перад ад'ездам Стымсон зрабіў аптымістычную заяву аб пэрспэктывах канфэрэнцыі па раззбраеньні. На тым-жа параходзе ехаў у Эўропу адзін з саўдасьпікаў банкірскага дому Моргана—Ламонт. Дзяржаўны дэпартамант ня раз указваў, што Стымсон выяжджае ў Жэнэву толькі для ўдзелу ў канфэрэнцыі па раззбраеньні. У добра асьвядомленых колах зазначаюць, што Стымсон мае намер абмеркаваць далёка-ўсходнюю праблему ў цэлым. Вашынгтон адчувае сваю ізаляванасьць у далёка-ўсходнім пытаньні. Англія, Францыя і Галяндыя не аказалі ПАЗШ пад трыманьня, якое прадугледжваецца дагаворам дзевяці дзяржаў. У афіцыяльных колах указваюць, што прыняты палатай прадстаўнікоў законапраекты аб зьмене палітычнага статуту Філіпін, а таксама японская агрэсія ў Кітаі, падарвалі «прэстыж белай расы» — прэстыж эўрапэйскай і амэрыканскай калёніяльнай сыстэмы на Далёкім Усходзе. У некаторых добра асьвядомленых колах лічаць, што Стымсон робіць спробу дабіцца эўрапэйска-амэрыканскага супрацоўніцтва ў далёка-ўсходнім пытаньні.

Паведамленьне

— Дом камасьветы. 11 красавіка, у 7 гадз. веч., пакой № 6,—кансультацыя для прапагандыстаў гарадзкой сеткі партасьветы і для вайсковых прапагандыстаў на тэму: «Сусьветны эканамічны крызіс, небясьпека вайны і задачы Камінтэрну».

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

11 красавіка г.г. у 6 гадзін вечера, у памяшканьні Дому Камасьветы (рог вул. Карла Маркса і Энгельса) склікаецца

ГАРАДЗКІ СХОД ПАРТАКТЫВУ

ПАРАДАК ДНЯ:

Выкінні выкананьня прамфінпляну за першы квартал

(даклады Мэталяб'яднаньня, Скураб'яднаньня, Шэвяб'яднаньня і Наркамснабу).

На сход партактыву запрашаюцца: трыкутнікі прадпрыемстваў і гаспадарчых устаноў і арганізацый, фракцыі ЦП прафсаюзаў, сакратары цэхавых, групорг і парторгі, загадчыкі цэхаў і майстры (камуністы).

Сакратаром калектыву і яч. КП(б)Б належыць атрымаць білеты на сход партактыву ў гаркоме КП(б)Б (пакой № 10) 10 і 11 красавіка з 9 гадз. раніцы да 4 гадз. дня.

Члены ЦК і ЦККК, гаркому і гар. КК КП(б) праходзяць на сход партактыву па сваіх мандатах.

Менгарком КП(б)Б.

Менскі Гарком КП(б)Б і рэдакцыя газ. „Рабселькор"

СКЛІКАЮЦЬ

11 красавіка ў памяшканьні рэдакцыі „Рабселькора"

(Савецкая 63, другі паверх) у 5 гадзін увечары

нараду рэдактароў шматтыражак

па пытаньні падрыхтоўкі

да 20-годзьдзя „Правды"

Менскі Гарком КП(б)Б

Рэдакцыя газэты „РАБСЕЛЬКОР"

Менгарсавет Асоавіяхіму даводзіць да ведама ўсіх сакратароў яч. Асоавіяхіму,

што 12 красавіка у 6 г. веч., у памяшк. Бендзяржтэатру адкрываецца

ГАРАДЗКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ АСОАВІЯХІМУ.

Выдача мандатаў пачынаецца 10-IV з 11 гадзін раніцы да 10 гадз. веч., у памяшканьні Менгарсавету Асоавіяхіму (Пляц Волі, 4).

За атрыманьнем мандатаў зьявіцца сакратаром ячэйкі Асоавіяхіму і дэлегатам.

МЕНГАРСАВЕТ АСОАВІЯХІМУ.

Усебеларускі Арганітэт VI Мэндэлеёўскага зьезду сумесна з ТВИД

СКЛІКАЕ

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ СХОД ХЭМІКАЎ—

навуковых працаўнікоў, ІТР, работнікаў навукова-дасьледчых інстытутаў, гаспадарчых арганізацый, рабочых хімічнай прамысловасьці і студэнцтва.

ПАРАДАК ДНЯ:

1) Уступнае слова старшыні камітэту прэзыдэнта БАН тав. Горына.

2) Хэмію на службу сацыялістычнаму будаўніцтву (у сувязі з задачамі VI Мэндэлеёўскага зьезду) дакл. тав. Гінзбурга.

3) Абгаворкі (тав. Круцілаў).

Сход адбудзецца 13 красавіка, у 7 гадз. веч., у актавай залі БАН (рог Ленінскай і Універсытэцкай, 2-гі паверх).

Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі

ВЫШЛА З ДРУКУ

Даўгаполаў Х. Л.

АБ ПРАВЯДЗЕНЬНІ АНТЫВЯЛІКОДНАЙ КАМПАНІІ 1932 ГОДУ.

Тыр. 15000, ст. 32, ц. 20 кап.

ПРОДАЖ УТВАРАЕЦЦА ВА ЎСІХ КНІГАРНЯХ ДВВ, СПАЖЫЎКАПЗРАЦЫІ І САЮЗДРУКУ.

СЭКТАР КНІГАГАНДЛЮ.

КІНО „Інтэрнацыянал" СЁНЬНЯ і ШТОДЗЕННА

мастацкі фільм вытворч. Дзяржкінпрам Грузіі

Цыганская кроў

ДОМ ПРАЦАСЬВЕТЫ.

Сёньня, 11-4 у 8 гадзін вечара адбудзецца

Інтэрнацыянальны вечар саюзу працасьветы з рабочай нямецкай дэлегацыяй.

ПАРАДАК ВЕЧАРУ:

1. Даклад „МОПР'у" аб бедным тэрроры ў капіталістычных краінах і задачы „МОПР'у".

2. Мастацкая частка.

3. Сустрэча шахматыстаў.

Зборная рабочая команда Нямеччыны.—Зборная саюзу працасьветы г. Менску.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ

СЁНЬНЯ, 11 красавіка і штодзённа

РЫЧАРД ТОЛМЭДЖ

У ТРУКАВЫМ ФІЛЬМЕ

ГУЛЬНЯ З АГНЕМ

ПАЧАТАК дзённых сеансаў у 2 г. і 3 г. 30 м. вечарніх—5-30, 6-50, 8-10, 9-30 і 10-50

Каса адкрыта з 12 гадз. дня.

Пры плянава-эканамічным інстытуце АДКРЫВАЮЦЦА

9-месячныя КУРСЫ

для падрыхтоўкі ў інстытут без адрыву ад вытворчасьці.

Стыпэндыяй і інтэрнатам слухачы не забясьпечваюцца.

Прыём заяў да 25-IV-32 г.

Унгарадок, галоўны корпус, другі паверх, пак. 209.

Дырэкцыя плянава-эканамічнага ін-ту.

ІНСТЫТУТ ПРАДЗІЛЬНЫХ КУЛЬТУР

абвяшчае прыём курсантаў на падрыхтоўчыя пяці-месячныя

КУРСЫ

(у колькасьці 90 асобь. Паступаючыя павінны мець адукацыю не ніжэй 7-годзі. Заявы прымаюцца да 10 красавіка

Заняткі пачынаюцца з 15 красавіка 1932 г.

Заявы з дакумантамі накіроўваюцца на адрасе: БССР г. Горкі, Інстытуту прадзільных культур

Дырэктар Інстытуту Баранцоў

Чырвоная Зорка Каса—ад 1 г. дня.

Замежны мастацкі фільм Я ВОЛЬНЫ (ВІНАВАТЫ)

„СПАРТАК"

Мастацкі фільм РАЗГРОМ

драма ў 7 частках.

БЕЛСЬВІНАВОДТРЭСТ

прыводзіць НАБОР на

БУХГАЛЬТАРСКА-ЭКАНАМІЧНЫЯ КУРСЫ,

якія адкрываюцца ў Ленінградзе.

Умовы: стыпэндыя 200 руб. у месяц. Інтэрнат пры курсах і сталоўка.

Тэрмін курсаў 5 месяцаў. Папярэдняя абавязкова прахадзіньня практыкі ў саўгасах „Сьвіцязяводу" 1—1 з палов. месяцы. Па скончаньні курсаў адпрацаваць у саўгасах 2 гады.

На курсы прымаюцца: бухгальтары з 2-гадовым стажам або рэгулікаводы з 5-гадовым стажам.

Жадаючыя паступіць на курсы падаюць заявы з дакумантамі: аб годзе нараджэньня і адносінах да вайсковай павінасьці, аб сям. становішчы, аб адукацыі і стажы працы, аб вызваленьні з месца працы.

Дакумэнты падаваць да 15 красавіка на адрасе: Менск, Савецкая, 70, „Сьвінаводтрэст".

СЭКТАР КАДРАЎ.

БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК

(Інстытут Сав. Буд. і Права). 11-га красавіка г.г. у 6 гадзін вечера, у Інстытуце Савецкага Будаўніцтва і Права БАН (3-ці паверх) адбудзецца даклад т. Юрашкевіча

на тэму:

„Сэкцыя суды БССР і іх задачы".

УВАХОД ВОЛЬНЫ.

Мечск, друкарня «Зьвязды». Галоўлітбел № 337.